

# МАСТАЦТВА

## (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)

# 5



# МАСТАЦТВА

## (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2022

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 7.03(100)(075.3=161.3)
ББК 85(0)я721
М32

Аўтары: С. І. Колбышава, Ю. Ю. Захарына, В. А. Грачова, В. У. Гракава, М. А. Волк.

Пераклад з рускай *А. В. Афанасенкі*

Рэцэнзенты: кафедра музычна-тэарэтычных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва» (кандыдат мастацтвазнаўства дацэнт *Н. В. Бычкова*); настаўнік вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 21 г. Баранавічы» *У. У. Капачэня*

Матэрыялы электроннага дадатку размешчаны на рэсурсе https://e-vedy2.adu.by.

*Пры мастацкім афармленні выдання выкарыстаны ілюстрацыі з wikimedia.org, shutterstock.com і іншых крыніц (поўны пералік у электронным дадатку).*

ISBN 978-985-599-400-9

© Афанасенка А. В., пераклад на беларускую мову, 2022
© Афармленне. РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2022

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Дарагія сябры!

Вы пазнаёміцеся з новым вучэбным прадметам «Мастацтва». Пасадзейнічае ў гэтым вучэбны дапаможнік, які адкрые вам асаблівы свет — свет мастацтва. Ён напоўнены дзіўнымі фарбамі і гукамі, «гаваркімі» лініямі і формамі, выразнымі словамі і рухамі. Вы будзеце вучыцца разумець і адчуваць гэты дзіўны свет. Даведаецеся, што кожны твор непаўторны і ўнікальны. У адным знаходзіць адлюстраванне жыццё канкрэтнага чалавека, у іншым — лёс краіны або нават усяго чалавецтва.

У падарожжы вам дапамогуць каляровыя ілюстрацыі. Вы пазнаёміцеся з выдатнымі помнікамі архітэктуры, творамі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, літаратуры, музыкі, кіно.

Каб твор мастацтва адкрыў вам свае таямніцы, ставіцца да яго трэба вельмі паважліва. Будзе выдатна, калі вы з сябрамі і бацькамі будзеце фантазіраваць, выдумляць, ажыццяўляць творчыя задумы. Так вы зможаце таксама паспрабаваць сябе ў ролі мастака.

У вучэбным дапаможніку вам прапануецца шмат заданняў. Кожнае з іх — толькі зыходны пункт цікавага падарожжа, у якім мастак — менавіта вы. Веды і вопыт, атрыманыя на ўроках выяўленчага мастацтва і музыкі, абавязкова дапамогуць вам.

Разважайце, дзяліцеся сваімі ўражаннямі, задавайце адзін аднаму пытанні, наведвайце музеі і выставы, хадзіце ў тэатры, глядзіце кінафільмы і тэлеперадачы! І вам захочацца стварыць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

свой мастацкі твор. А вучэбны дапаможнік пасадзейнічае вам у гэтым, падкажа ідэі.

Ствараць — гэта вялікае задавальненне. А якая радасць, калі твор знаходзіць свайго прыхільніка.

У добры шлях!

***Умоўныя абазначэнні:***

— паглядзіце ў электронным дадатку;

— знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 1

МАСТАЦТВА — САМЫ ЦУДОЎНЫ, САМЫ СТРОГІ І САМЫ РАДАСНЫ... ШЛЯХ ЧАЛАВЕКА ДА ДАБРА, ДА ІСЦІНЫ І ДАСКАНАЛАСЦІ.

*Томас Ман*

# УВОДЗІНЫ Ў СВЕТ МАСТАЦТВА



**А́ўгуст Фры́дрых Зі́герт.** Юны знаўца мастацтва

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 1. ШТО ТАКОЕ МАСТАЦТВА?



Чырвонафігурная пелі́ка



Выява бізона ў пячоры Альтамі́ра (Іспанія)



Шлем старажытнарымскага воіна

***Вытокі.*** У штодзённым жыцці мы часта сустракаемся са словам «мастацтва». Мы чуем гукі музыкі, бачым жывапісныя і скульптурныя работы, архітэктурныя пабудовы. Аднак ці зможам мы адразу адказаць на пытанне *«Што такое мастацтва?»*

Не варта засмучацца, калі гэта пытанне выклікае цяжкасць. Даследчыкі з усяго свету шукаюць на яго адказ, але так і не прыйшлі да адзінага тлумачэння слова «мастацтва». Толькі ў адным усе спецыялісты пагаджаюцца — простага і адназначнага адказу на гэта пытанне не існуе.

Разам з тым важна і іншае пытанне: *«Чаму людзі ва ўсе часы ў розных кутках планеты імкнуцца да зносін з мастацтвам?»*

Са старажытных часоў чалавек ствараў малюнкі і рэльефы ў каменных пячорах. Гэта былі адбіткі рук, выявы жывёл, сцэны палявання. Пазней з’явіліся ўнікальныя малюнкі на посудзе, прыладах працы, ювелірных вырабах. Удасканальвалася жыллё — ад невялікіх пабудоў, такіх як шалаш, зямлянка, да складаных і гіганцкіх формаў.

Чым жа можна патлумачыць цікавасць чалавека да такой складанай працы? Чаму, нягледзячы на няпростыя ўмовы жыцця, ён знаходзіў час і магчымасці для стварэння мастацкіх твораў? І галоўнае — навошта гэта было патрэбна?

На гэтыя пытанні адказаць няпроста. Аднак менавіта жаданне *адлюстраваць*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прадметы і з’явы навакольнага свету стала пачаткам нараджэння мастацтва.

***Навошта чалавеку мастацтва?*** Не адразу мастацтва стала такім, якім мы яго сёння ўспрымаем, наведваючы музеі, выставы або канцэртныя залы. У старажытнасці яно з’яўлялася часткай штодзённага жыцця чалавека. Напрыклад, перад паляваннем ён маляваў жывёлу, на якую збіраўся паляваць. Лічылася, што гэта прынясе поспех. З дапамогай музыкі і спеваў чалавек звяртаўся да духаў, каб тыя дапамаглі яму здзейсніць задуманае...



Грэбень — ювелірнае ўпрыгажэнне скіфаў

Мастацтва вылучылася ў асобную, *самастойную* сферу дзейнасці чалавека значна пазней. Пра гэта гаворыцца ў старажытнагрэчаскім міфе пра бога Апалона, які сабраў вакол сябе дзевяць муз — апякунак мастацтваў. Кожная муза ўвасабляла адзін з відаў мастацтва — паэзію, музыку, танец, тэатр...

Пра чароўную сілу мастацтва нам апавядаюць шматлікія мастацкія творы. У міфе Старажытнай Грэцыі «Арфе́й і Эўрыды́ка» расказваецца пра тое, як сіла музыкі змагла спыніць вечны кругаварот прыроды.



**Камі́ль Каро.**
Арфей і Эўрыдыка
(фрагмент)

Птушкі зляцеліся слухаць спевака. Нават дрэвы рушылі з месца і абкружылі Арфея; дуб і тапаля, стройныя кіпарысы і шыракалістыя платаны, хвоі і елкі тоўпіліся вакол і слухалі спевака; ні адна галінка, ні адзін ліст не дрыжаў на іх.

*Мікалай Кун.*
*Легенды і міфы Старажытнай Грэцыі*

Гэты літаратурны ўрывак сугучны мелодыі з оперы «Арфей і Эўрыдыка», створанай нямецкім кампазітарам Кры́стафам Вілібá льдам Глю́кам. Выразны тэмбр флейты, поўныя светлага смутку сыходныя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Амфітэатр Калізе́й
(Італія)



Музы.
Старажытнагрэчаскі рэльеф

інтанацыі передаюць стан Арфея, які моліцца пра выратаванне Эўрыдыкі. Злыя сілы не могуць супрацьстаяць сіле мастацтва і паступова адступаюць.

Пазнаёміўшыся з мастацкімі творамі, вы даведаліся пра значэнне мастацтва ў жыцці чалавека. А вось што такое мастацтва, вы зразумееце, калі ўважліва прачытаеце гэты вучэбны дапаможнік. І выдатна, калі ў кожнага з вас з'явіцца свой адказ на гэта складанае пытанне.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Успомніце 2–3 творы выяўленчага і музычнага мастацтва, якія вам асабліва падабаюцца.

2. Разгледзьце творы, якія прадстаўлены ў параграфе і ў электронным дадатку. Паразважайце, што ж такое мастацтва. Выкарыстоўвайце мастацкія прыклады, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках музыкі і выяўленчага мастацтва, а таксама пры наведванні музеяў, выставачных залаў, філармоніі і інш.

3. Паслухайце ў электронным дадатку мелодыю для флейты з оперы «Арфей і Эўрыдыка» Крыстафа Вілібальда Глюка. Якое ўражанне зрабіла на вас мелодыя? Які настрой перададзены ў ёй?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

4. Міф пра Арфея і Эўрыдыку апавядае пра ўплыў музыкі на прыроду і чалавека. Вывучыце ў інфармацыйных крыніцах гісторыю Арфея і Эўрыдыкі больш падрабязна і раскажыце яе ў класе. Якую назву для гэтага твора вы прапанавалі б? Чаму?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 2

ХУДОЖНИК — ДЕЯТЕЛЬ ИСКУССТВА.
В КАРТИНАХ ОТРАЖАЕТ ОН
СОБЫТИЯ, ПРИРОДУ, ЧУВСТВА,
СВЯЗЬ ПОКОЛЕНИЙ И ВРЕМЁН...
*Вольга Паве́шчанка*

# РОЛЯ ТВОРЦЫ Ў МАСТАЦТВЕ



**Алег Куку́шкін.** Мастак (Расія)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 2. ПРА ШТО РАСКАЗВАЕ МАСТАК?



**Пэр Барэль дэль Каса.**
Уцякаючы ад крытыкі

**А́ўтар — стваральнік мастацкага твора.**



**Валянцін Сяроў.**
Дзяўчынка з персікамі

Цяжка ўявіць чалавека, якога мастацтва пакідае безуважным. Самі таго не заўважаючы, мы дзелімся з сябрамі ўражаннямі ад прагледжанага фільма, пачутай музыкі, убачаных пабудоў.

А цяпер уявіце, што мастацтва знікла з нашага жыцця. Вядома, свет не спыніць свайго існавання. Застануцца сонца, неба, зоркі, цікавыя прафесіі. Застанецца сам чалавек. Аднак яго жыццё стане нашмат бяднейшым, таму што менавіта мастацтва ўзбагачае яго разнастайнымі фарбамі, напаўняе яркімі эмоцыямі і ўражаннямі.

Мастацтва — універсальная мова зносін. Яе разумеюць людзі розных узростаў, нацыянальнасцей, прафесій.

Кожны чалавек камунікуе з мастацтвам па-свойму. Хтосьці любуецца маляўнічымі палотнамі, хтосьці не разлучаецца з музыкай. А хтосьці, як хлапчук на карціне Пэ́ра Барэ́ля дэль Ка́са «Уцякаючы ад крытыкі», здольны ўявіць сябе ўнутры твора мастацтва.

Працэс стварэння мастацкага твора загадкавы і таямнічы. Ніхто не можа адказаць на пытанні, дзе мастак бярэ ідэі для твораў і як фантазія *аўтара* пераўтварае ідэю ў бачны ці чутны вобраз.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Азірніцеся навокал! Перад вамі — свет, напоўнены разнастайнымі пачуццямі, думкамі, ідэямі, падзеямі. Усё гэта можа стаць *тэмай* мастацкага твора.

Напрыклад, на карціне мастака Валянціна Сярова — звычайная дзяўчынка. Магчыма, яна падобная да каго-небудзь з вашых знаёмых? Цяпер паназіраем за дзяўчынай, якая сядзіць на гранітнай скале. Пра што яна так кранальна сумуе? Што асаблівага бачаць паэты і мастакі ў скульптуры «Малочніца», створанай рускім скульптарам Паўлам Сакаловым?



**Павел Сакалоў.**
Малочніца (Расія)

И ослепительно стройна,
Поджав незябнущие ноги,
На камне северном она
Сидит и смотрит на дороги...

*Ганна Ахма́тава*

**Тэ́ма маста́цтва —** з'явы або падзеі, на якія аўтар хоча звярнуць нашу ўвагу.



**Мікалай Рэрых.**
Сеча пры Кержанцы (эскіз дэкарацыі да оперы «Паданне пра нябачны град Кіцеж і панну Фяўронію»)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

А ў музычным творы «Се́ча пры Ке́ржанцы» Мікалая Ры́мскага-Корсакава — эпізод гістарычнай бітвы. Калі быць уважлівым, то можна не толькі пачуць гукі бітвы, адчуць рытм коней, якія скачуць, але і ўявіць вобразы людзей, якія ваююць.

Свет мастацтва дзіўны. Ён нібы вытканы са шматлікіх тэм і сюжэтаў. Кожны новы твор мастацтва — новая сустрэча і новая загадка. Засталося толькі пастарацца разгадаць яе...

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. У гэтым параграфе вы даведаліся, хто такі аўтар твора мастацтва. Пералічыце мастацкія творы (жывапісу, скульптуры, музыкі, архітэктуры), з якімі вы пазнаёміліся ў гэтым параграфе і электронным дадатку. Якія творы мастацтва створаны сучаснымі аўтарамі? Чаму вы так вырашылі?

2. Паслухайце сімфанічную карціну «Сеча пры Кержанцы» Мікалая Рымскага-Корсакава. Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю работы Мікалая Рэ́рыха з аднайменнай назвай. Якія пачуцці ў вас выклікаюць абодва творы? Пра што расказваюць аўтар-жывапісец і аўтар-кампазітар? Якая тэма адлюстравана ў гэтых творах?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Раскажыце сваім сябрам пра мастацтва. Якія героі вам цікавыя? Над якой важнай праблемай вам хацелася б паразважаць? Якія віды мастацтва вы выбралі б для сваёй творчасці? Падзяліцеся сваімі ідэямі з аднакласнікамі. Давайце паспрабуем рэалізаваць вашы прапановы ў гэтым навучальным годзе!

## § 3. ІНСТРУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ МАСТАКА

***Як з'яўляецца твор мастацтва?*** Для таго каб наблізіцца да разгадкі таямніцы мастацкага твора, паспрабуем прыадкрыць заслону і паназіраць за працэсам яго стварэння. Зазірнём у мастацкую майстэрню. Што там нас чакае?

Спачатку мы ўбачым аўтара мастацкага твора. Незалежна ад таго, над чым працуе аўтар — над карцінай, скульптурай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ці музычным творам, мы будзем называць яго Мастаком. Мастаком з вялікай літары...

Мастак выбірае *тэму* будучага твора і *сродкі*, якія спатрэбяцца для яе мастацкага ўвасаблення. Адзін Мастак выкарыстоўвае *колер*, другі выбірае *слова*, трэці — *гук*... Гэта значыць, у кожнага віду мастацтва свая мова. Нельга да канца зразумець чалавека, калі размаўляць з ім на розных мовах. Так і ў мастацтве. Каб зразумець Мастака, трэба разумець мову, на якой ён размаўляе.



**Вінцэнт Ван Гог.**
Сланечнікі

**Від маста́цтва** — форма творчай дзейнасці, у якой аўтар увасабляе сваю ідэю, задуму.

Пры стварэнні карціны «Сланечнікі» галандскі мастак Вінцэ́нт Ван Гог выкарыстоўваў сакавітыя аранжавыя і жоўтыя тоны. Можна меркаваць, што яркая колеравая гама з'яўляецца ўвасабленнем сонца і радасці. Сланечнікі здаюцца жывымі, напоўненымі асаблівай энергіяй — вось-вось галоўкі кветак нахіляцца да нас і шапнуць пра штосьці вельмі важнае...

Якія ж інструменты і матэрыялы спатрэбіліся жывапісцу ў яго працы? Карціна «Юны мастак» французскага мастака



**Франсуа-Юбер Друэ.**
Юны мастак

**Сродкі маста́цкай вы́разнасці** — мова, з дапамогай якой розныя віды мастацтва камунікуюць з намі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Эцьен Марыс Фальканэ.**
Пагрозлівы Амур



**Віторыа Рыньяна.**
У майстэрні скульптара

Франсуа́-Юбе́ра Друэ́ падкажа адказ. Разгледзеўшы яе, вы заўважыце палатно, палітру, фарбы, пэндзлі...

У скульптуры «Пагрозлівы Амур» Эцье́на Мары́са Фальканэ́ бог кахання Амур выяўлены ў вобразе гуллівага, загадкавага хлопчыка. Прыціскаючы пальчык да вуснаў, ён заклікае нас да маўчання, дзякуючы чаму мы, гледачы, нібы становімся датычнымі да тайны юнага бажаства.

Якія інструменты і матэрыялы выкарыстоўвае скульптар? І зноў падказка. На карціне «У майстэрні скульптара» італьянскага мастака Віторыа Рынья́на мы бачым майстра, які трымае ў адной руцэ разец, у другой — амаль гатовую фігурку хлопчыка на шары.

У сваёй працы скульптары выкарыстоўваюць альбо цвёрдыя матэрыялы — мармур, дрэва, альбо пластычныя (мяккія) матэрыялы — гліну, воск...

Апавяданні, казкі, вершы складаюцца са слоў. З дапамогай слоў мы размаўляем з сябрамі. Але слова з'яўляецца таксама асноўным сродкам выразнасці мовы пісьменніка. Прыслухайцеся да шуму крылаў птушак у вершы Рыгора Барадуліна. Так і хочацца падняць галаву і паназіраць за птушкамі.

Шум чуваць з усіх бакоў —
Ля шыпшыны шмат шпакоў.

*Рыгор Барадулін (са зборніка «Воз вёз лёс»)*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Музычнае мастацтва ствараецца з дапамогай гукаў. Выкарыстоўваючы разнастайнасць іх спалучэнняў, кампазітар «малюе» вобразы чалавека, прыроды, з'яў навакольнага свету. У музыцы мы можам пачуць інтанацыі чалавечай гаворкі, смеху, плачу. А можам, слухаючы яе, уявіць, як маршыруюць салдаты, танцуюць дзеці, адчуць подых ветру або шум марскога прыбою.

**Архітэкту́ра** — мастацтва ствараць будынкі і збудаванні.

У знакамітым «Вальсе» выдатны кампазітар Ара́м Хачатура́н здолеў перадаць слухачу найглыбейшыя чалавечыя перажыванні. Парывістая, страсная, усхваляваная музыка вальса звяртае нас да чалавека, яго пачуццяў і пакут. Музыка «Танца № 10» са знакамітага Астраме́чаўскага рукапісу* «малюе» іншую карціну: грацыёзныя



**Джава́ні Мары́я Бернардоні.**
Касцёл Божага цела (Фарны)
(г. Нясвіж, Беларусь)



**Уладзімір Жба́наў.**
Дойлід
(г. Мінск, Беларусь)

* Астрамечаўскі рукапіс (вядомы таксама пад назвай «Полацкі сшытак») — помнік музычнай культуры, у якім сабраны песні і танцы, распаўсюджаныя на беларускіх землях у XVII стагоддзі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

рухі пар у прыгожых адзеннях на балі ў велізарным старадаўнім замку.

*Архітэктуру* часта называюць «застылай музыкай». Як няма двух аднолькавых музычных твораў, так няма двух аднолькавых помнікаў архітэктуры. Любы твор архітэктара: жылы дом, бібліятэка або мост — адлюстроўвае яго ўяўленні аб прыгажосці.

У музыцы «малююць» гукам. У паэзіі выкарыстоўваецца слова. Сродак выразнасці ў жывапісе — колер. У архітэктуры і скульптуры важныя форма і аб'ём. Калі вы навучыцеся разумець асноўныя сродкі выразнасці ў розных відах мастацтва, то пачуеце голас Мастака і наблізіцеся да таямніцы яго твора.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Разгледзьце творы мастацтва, прадстаўленыя ў параграфе і электронным дадатку. Да якіх відаў мастацтва яны адносяцца? Прывядзіце прыклады твораў розных відаў мастацтва, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках музыкі і выяўленчага мастацтва раней.

2. З параграфа і электроннага дадатку вы даведаліся пра інструменты і матэрыялы жывапісца і скульптара. Назавіце інструменты і матэрыялы, якімі карыстаюцца кампазітар, пісьменнік, фатограф.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах «Танец № 10» з Астрамечаўскага рукапісу. Апішыце яго характар. Чым, на ваш погляд, танцавальная музыка XVII стагоддзя адрозніваецца ад сучаснай: характарам, рытмам, тэмпам ці манерай выканання? Як вы думаеце чаму? Пафантазіруйце і падбярыце танцавальныя рухі, якія адпавядаюць характару «Танца № 10».



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 3

...ГОЛАС ПРЫГАЖОСЦІ ГУЧЫЦЬ ЦІХА:
ЁН ПРАНІКАЕ ТОЛЬКІ Ў САМЫЯ
ЧУЙНЫЯ ВУШЫ.

*Фры́дрых Ні́цшэ*

# ЦУДОЎНАЕ Ў МАСТАЦТВЕ



**Леана́рда да Ві́нчы.** Мадонна Літа

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 4. ПРЫГАЖОСЦЬ У МАСТАЦТВЕ І ЖЫЦЦІ

*«Як прыгожа!»* — гэтыя словы хоць аднойчы ў жыцці прамаўляе кожны чалавек. На пытанне *«Што прыгожа?»* адказаць нескладана. Адчуванне прыгажосці выклікаюць кропля дажджу на пажоўклым кляновым лісце, мудрагелістая форма сняжынкі, вячэрні захад сонца. Мы захапляемся маляўнічым палатном, скульптурай, мелодыяй і паэтычным радком.

Знайсці адказ на пытанне *«Чаму гэта прыгожа?»* значна складаней. Магчыма, мы проста *адчуваем* прыгажосць розных з'яў і выказваем сваё захапленне з дапамогай слова «прыгожа». А ці заўсёды мы задумваемся, што азначае гэта слова?

**Ідэа́л** — найлепшы, дасканалы ўзор.

Кожная эпоха мае свой *ідэал* прыгажосці. Мяняецца час — і мяняецца ідэал. Тое, што лічылася прыгожым у старажытных грэкаў або рымлян, не заўсёды адпавядае ідэалам прыгажосці ў XXI стагоддзі.

Дзякуючы творам мастацтва мы даведваемся пра тое, як жылі і што шанавалі нашы продкі.

Давайце параўнаем жаночыя вобразы, якія стварылі французскі мастак П'ер Агюст Рэнуа́р і беларускі жывапісец Іван Хру́цкі. Гераіні адрозніваюцца адна ад адной узростам, характарам, настроем, знешнім выглядам. Але пры гэтым на абедзвюх карцінах прысутнічае нешта агульнае — ледзь улоўная пяшчота і кранальнасць. Унутраная стрыманасць гераінь *гарманіруе* са знешнім выглядам.



**П'ер Агюст Рэнуар.**
Партрэт мадэмуазэль Легра́н



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Іван Хруцкі.**
Партрэт жанчыны з кветкамі і садавіной

Асаблівае захапленне ў чалавека выклікаюць помнікі архітэктуры. Мы павольна рухаемся вакол Барысаглéбскай царквы ў горадзе Гродна. Уважліва ўглядаемся ў розныя дэталі —

**Гармонія** — сугучча, узгодненасць, зладжанасць розных элементаў.





Барысаглебская (Каложская) царква (г. Гродна, Беларусь)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

захапляемся цікавымі фасадамі, колеравай гамай. А вось сляды разбурэнняў...

Цяпер зойдзем унутр царквы. Высокія скляпенні, царкоўныя рэчы, спевы, што напаўняюць храм таямнічым гучаннем... Пачуццё гармоніі, супакаення, светлага суму выклікае ў нас унутранае ўбранне храма.

Прыгажосць чалавечых перажыванняў геніяльна адлюстроўвалі ў сваіх музычных творах вялікія кампазітары. Услухаемся ў кранальную мелодыю прэлюдыі мі мінор польскага кампазітара Фрэдэры́ка Шапэ́на. Музычныя інтанацыі, нібы застылыя слязінкі, мякка і ненавязліва пранікаюць у глыбіню нашай душы. Зусім іншыя пачуцці дорыць лёгкая, як уздых, «Маленькая начная серэнада» Вольфганга Амадэ́я Моцарта. Навакольны свет імгненна напаўняецца захапленнем, асалодай і жыццесцвярджальным сэнсам.

Кожны Мастак па-свойму дапамагае нам, гледачам і слухачам, зразумець, што такое прыгажосць. Аўтар дзеліцца сваім вопытам, сваімі пачуццямі і перажываннямі. Ён запрашае нас да самастойнага разважання аб прыгажосці ў жыцці і мастацтве.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Назавіце твор мастацтва, які вы лічыце гарманічным. У чым, на ваш погляд, праяўляецца гармонія ў гэтым творы?

2. Паслухайце ў электронным дадатку прэлюдыю мі мінор Фрэдэрыка Шапэна і «Маленькую начную серэнаду» (1-ю частку) Вольфганга Амадэя Моцарта. Якія вобразы ўзнікаюць у вашым уяўленні? Пагартайце старонкі вучэбнага дапаможніка і выберыце ілюстрацыі, сугучныя настрою музыкі. Патлумачце свой выбар.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Ці ведаеце вы, што музыку можна маляваць? Паспрабуем разам стварыць кампазіцыю «Маленькая начная серэнада» пад уражаннем музыкі В. А. Моцарта. Для гэтага:

- уключыце музыку;



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

- падбярыце для вашай кампазіцыі неабходную колеравую гаму (2–3 адценні);
- з дапамогай алоўкаў або фламастараў на аркушы паперы адлюструйце лініямі і штрыхамі рух мелодыі (узыходны або сыходны, плаўны або скачкападобны).

Ці спадабалася вам ствараць карціну пад музыку?

## § 5. ПЕРАЎТВАРАЛЬНАЯ СІЛА МАСТАЦТВА

Як правіла, чалавек звязвае мастацтва з прыгажосцю. І гэта не выпадкова! Навука вывучае законы светабудовы. Рэлігія адказвае на пытанні дабра і маралі. І толькі ў мастацтве на поўную сілу раскрываюцца ўяўленні людзей аб прыгажосці. Менавіта прыгажосць *мастацкага вобраза* прымушае нас, гледачоў і слухачоў, затрымаць сваю ўвагу на творы мастацтва і задумацца. Магчыма, нават памарыць.

**Маста́цкі вобраз** — свет, створаны ўяўленнем мастака.



Кадр з тэлефільма «Казка пра Зорнага хлопчыка» (рэжысёр Леанід Няча́еў)



**Віктар Васняцоў.** Кашчэй Несмяротны (фрагмент)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ствараючы мастацкія вобразы, Творца выкарыстоўвае сваё ўяўленне, фантазію. Ён не проста апісвае жыццё, не проста паўтарае з'явы і падзеі. Ён дапаўняе іх, а часам стварае нанава!

Прыгожая музыка, пачутая аднойчы, у нашай памяці застаецца надоўга. Напрыклад, ада́жыа з балета «Маленькі прынц» беларускага кампазітара Яўгена Гле́бава ці «Мелодыя» для флейты з оперы «Арфей і Эўрыдыка» Крыштафа Вілібальда Глюка. Што робіць гэту музыку для нас цудоўнай? Якія сродкі выразнасці найбольш моцна ўздзейнічаюць на слухача: прыгожая мелодыя, аксамітны тэмбр музычных інструментаў або рытм, які заварожвае? А можа, гэта само развіццё музыкі, якое нагадвае калейдаскоп з займальнай зменай формаў і фарбаў?

У мастацтве прадстаўлены розныя вобразы: радасныя і сумныя, камічныя і трагічныя, прыгожыя і брыдкія. Але брыдкае ў жыцці не заўсёды адпавядае брыдкаму ў мастацтве. «Чаму?» — запытаецеся вы. На гэта пытанне нам адкажуць творы мастацтва.

Бывае так, што вобразы прыгожага і брыдкага размешчаны ў адной прасторы. Напрыклад, у карціне «Кашчэй Несмяротны» рускага мастака Віктара Васняцова.

У казцы «Дзень нараджэння Інфанты» англійскага пісьменніка Оскара Уа́йльда прыгожае праяўляецца ў гісторыі маленькага Карліка.

...Карлік быў сапраўды жахлівы, і нават пры іспанскім двары, вядомым сваёй прыхільнасцю да ўсяго брыдкага, такой фантастычнай маленькай пачвары яшчэ не бачылі.

Паступова мы знаёмімся з Карлікам бліжэй — з яго добрым і чыстым сэрцам, цёплым і трапяткім стаўленнем да ўсяго жывога, і перш за ўсё да Інфанты *(іспанская прынцэса)*. І мы зусім забываем пра яго непрыгожую знешнасць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




**Таццяна Ма́ўрына.**
Ілюстрацыі да казкі «Царэўна-жаба»

Толькі птушкі не абураліся ягонай брыдкасцю. Хлопчык быў добры да іх: у лютую зімовую сцюжу, калі на дрэвах няма ягад і зямля становіцца цвёрдай, як жалеза, а ваўкі падыходзяць да самых варот горада ў пошуках ежы, ён ніколі не забываў пра іх — заўсёды кідаў ім крошкі ад свайго акрайца чорнага хлеба і дзяліў з імі свой сняданак, якім бы бедным ён ні быў...

Стаўленне чытача да Прынцэсы, якая мае знешнюю прыгажосць, але жорсткае сэрца, вызначаецца не яе знешнасцю, а ўчынкамі.

Прыгожы чалавек... Гэта чалавек з прыгожымі, правільнымі рысамі твару? Ці гэта чалавек добры і высакародны?

А вось яшчэ адно ператварэнне. Васілісу Прамудрую Кашчэй Несмяротны ператварыў у жабу. Вобраз жабы не выпадковы. Многія майстры мастацтва выкарыстоўвалі яго, каб узмацніць значэнне брыдкага. Ператварэнне жабы ў царэўну магчыма толькі ў мастацтве.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дык што ж з'яўляецца больш важным і ў жыцці, і ў мастацтве: знешняя прыгажосць або ўнутраная, форма або змест? Свой адказ на гэта пытанне нам прапануюць майстры мастацтва. Дзякуючы супрацьпастаўленню прыгожага і брыдкага мы, гледачы і слухачы, больш ярка ўяўляем мастацкія вобразы і лепш іх запамінаем.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Назавіце творы мастацтва, у якіх адлюстраваны сумныя і вясёлыя, прыгожыя і брыдкія, рэалістычныя і фантастычныя вобразы. Выкарыстоўвайце мастацкія прыклады, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках выяўленчага мастацтва і музыкі, а таксама творы, прапанаваныя вам у параграфе і электронным дадатку.

2. Паглядзіце ў электронным дадатку фрагмент мастацкага фільма «Казка пра Зорнага хлопчыка» беларускага кінарэжысёра Леаніда Нячаева. Раскажыце, ці замінае вам знешнасць карліка бачыць у ім прыгожае.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Калі будзеце слухаць ваш любімы музычны твор, уявіце, што вы разглядаеце яго ў калейдаскопе. Каляровымі алоўкамі выканайце замалёўкі рознакаляровых узораў, адценняў і блікаў, якія ўзнікаюць у вашым уяўленні. Паспрабуйце адлюстраваць на аркушы паперы рух мелодыі, цікавы рытмічны малюнак або гук з дапамогай разнастайнасці колеру, ліній і формаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 4

СТАТУЮ ЎПРЫГОЖВАЕ ВЫГЛЯД.
А ЧАЛАВЕКА — ЯГО ЎЧЫНКІ.
*Піфагор*

# ЧАЛАВЕК У МАСТАЦТВЕ



**Алег Шупля́к.** Аўтапартрэт пад шатамі ліп

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 6. ПРА ШТО РАСКАЗВАЕ ПАРТРЭТ?



Бюст царыцы Неферціці (Старажытны Егіпет)

**Партрэ́т** — выява (апісанне) чалавека ці групы людзей.



**Пітэр Паўль Рубенс.** Эцюд галавы дзяўчынкі

***Партрэтны вобраз.*** Вобраз чалавека заўсёды прыцягваў Мастака. Дзякуючы магчымасцям мастацтва можна ўбачыць чалавека ў розным стане, зразумець яго характар, настрой, пачуцці...

Першае ўяўленне пра любога чалавека складваецца на аснове яго знешняга выгляду. Пры сустрэчы нават з незнаёмцам мы можам вызначыць яго пол, узрост, рост, асаблівасці целаскладу, колер валасоў. Мы звяртаем увагу на манеры, рухі, касцюм... Кожны чалавек індывідуальны. Прыкмячаючы асаблівыя знешнія рысы чалавека, а таксама яго душэўныя якасці, мы ствараем ва ўяўленні *партрэтны вобраз*.

Партрэтны вобраз чалавека стварае і Мастак. Для гэтага ён выкарыстоўвае выразныя сродкі розных відаў мастацтва. Адлюстроўваючы людзей, Майстар працуе ў жанры *партрэта*. Калі партрэт ствараецца сродкамі жывапісу, то атрымліваецца жывапісны партрэт. Калі сродкамі скульптуры, то перад намі скульптурны партрэт. Калі вобраз чалавека ствараецца выразнымі сродкамі музыкі, то вынікам становіцца партрэт музычны.

Аднак задача Мастака — не проста стварыць добрую копію аблічча чалавека. Мастак імкнецца паказаць яго ўнутраны свет, раскрыць характар, перадаць настрой. Пры гэтым, працуючы над партрэтам,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Мастак адлюстроўвае тое, што лічыць самым важным у *мадэлі*. Глядач жа па выразе вачэй, павароце галавы разгадвае гэты вобраз і спрабуе зразумець, як чалавек ставіцца да жыцця, да іншых людзей, да сябе.

***Партрэт — «ажыўшая» гісторыя.*** У розныя гістарычныя эпохі ў партрэтах людзей адлюстроўваліся рысы, уласцівыя пэўнаму часу. Таму перададзеныя ў творах мастацтва вобразы людзей мінулых эпох — гэта «ажыўшая» гісторыя.

Напрыклад, у мастацтве першабытных часоў адлюстраванне чалавека было, як правіла, звязана з тэмай палявання. У мастацтве старажытных цывілізацый, Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма ўяўленні пра чалавека пашыраюцца. Мастакі больш старанна працуюць над фігурай, паставай, рысамі асобы, элементамі касцюма.

Партрэт царыцы Неферціі створаны тры з паловай тысячы гадоў таму. Скульптар змог перадаць мяккасць, жаноцкасць і адначасова адухоўленасць жанчыны. Невялікая галава і гнуткая шыя поўныя вытанчанасці. У куточках рота стаілася ўсмешка.

Пазней Мастакі пачалі надаваць больш увагі дэталям: выразу твару, мііцы. Аднак найвялікшы росквіт мастацтва партрэта прыпадае на XVII–XVIII стагоддзі. Менавіта ў гэты час у партрэце ярка праяўляюцца ўнутраны свет чалавека, яго пачуцці і перажыванні.



**Рэмбрант.**
Партрэт старога ў чырвоным

**Мадэ́ль** — чалавек, які пазіруе мастаку.



**Рафаэль.**
Аўтапартрэт



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Марк Шагал.**
Аўтапартрэт ля мальберта

**Аўтапартрэ́т** — адлюстраванне мастаком самога сябе.

У партрэце дзяўчынкі, якая, магчыма, даводзіцца мастаку дачкой, фламандскі жывапісец Пі́тэр Паўль Ру́бенс перадаў яе жыццярадаснасць і гуллівасць. Дапытлівы позірк, лёгкая ўсмешка, румянец на шчочках адлюстроўваюць шчырасць і непасрэднасць дзіцяці. Залацістыя пасмы валасоў, якія выбіліся з акуратна сабранай прычоскі, выдаюць гарэзлівы характар дзяўчынкі.

Спакой, унутраную засяроджанасць і сум перадаў у «Партрэце старога ў чырвоным» галандскі мастак XVII стагоддзя Рэ́мбрант. Стомлены ад людскіх клопатаў стары паглыблены ў свой унутраны свет. Яго погляд, звернуты ў бясконцасць, поўны ўспамінаў аб пражытых гадах. Складзеныя на каленях рукі, якія не ведалі адпачынку і спакою, паказваюць на працавітасць старога. Сведкі падзей доўгага жыцця — глыбокія маршчыны на твары — падкрэсліваюць мудрасць, якая прыйшла з вопытам.

Разнавіднасцю партрэта з'яўляецца *аўтапартрэт*. Напрыклад, аўтапартрэт юнага Рафаэ́ля — гэта адзін са спосабаў спазнаць сябе. У «Аўтапартрэце ля мальберта» мы бачым аўтара карціны Ма́рка Шага́ла з традыцыйнымі атрыбутамі мастацтва.

Працуючы ў жанры партрэта, Мастак імкнецца не толькі захаваць для гісторыі рысы той ці іншай асобы, але і паказаць унутраны свет чалавека, яго характар, пачуцці і думкі.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Разгледзьце партрэты, прадстаўленыя ў параграфе і электронным дадатку. Якія віды мастацтва звяртаюцца да вобраза чалавека? Звярніце



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ўвагу на касцюм, упрыгажэнні і прычоскі герояў твораў. Як яны відазмяняюцца ў розныя эпохі?

2. Іспанскі мастак Дыéга Велáскес стварыў жанр партрэта-біяграфіі. Малюючы людзей на працягу некалькіх гадоў, мастак не толькі падкрэсліваў змены ў іх знешнім выглядзе, але і прыкмячаў унутраныя перамены, якія адбываюцца з імі. Прыгледзьцеся да партрэтаў інфанты Маргарыты. Чым адрозніваюцца гэтыя партрэтныя вобразы? Патлумачце свой адказ.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. У музычным партрэце «Вясёлы селянін, які вяртаецца з працы», створаным Робертам Шýманам, мы назіраем безжурботнага чалавека, які ідзе па палявой дарозе. Мы быццам чуем яго ўзнёслыя, радасныя спевы.
Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах фартэпіянную п’есу Роберта Шумана і стварыце ў сваім уяўленні карціну, галоўны герой якой — вясёлы селянін. Адлюструйце ў малюнку яго знешні выгляд, настрой, характар. Якія колеры вы ўзялі для фону карціны? Як музыка дапамагла вам выбраць сродкі мастацкай выразнасці?



**Дыега Веласкес.**
Партрэт інфанты Маргарыты
(3 гады)



**Дыега Веласкес.**
Партрэт інфанты Маргарыты
(5 гадоў)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 7. ЧАЛАВЕК НА ФОНЕ ГІСТОРЫІ



**Васіль Сурыкаў.**
Пераход Суворава праз Альпы (фрагмент)



**Невядомы мастак.**
Францішка Уршуля Радзівіл

Гісторыя любой дзяржавы — гэта чарада падзей, якія адбываюцца з удзелам многіх людзей. Кожны чалавек мае дачыненне да гісторыі. Ад таго, якія ўчынкі ён здзяйсняе, залежыць і яго роля ў гісторыі.

Гістарычныя асобы становяцца героямі літаратурных твораў, тэатральных пастановак, кінафільмаў. Ім прысвечаны творы выяўленчага мастацтва і музыкі.

На палатне «Пераход Суворава праз Альпы» рускага мастака Васіля Су́рыкава адлюстраваны знакаміты палкаводзец і яго адважныя салдаты. Мы бачым простых воінаў, якія апынуліся ў складаных і нязвыклых для іх умовах высакагор’я. Самаадданa пераадольваючы снежныя лавіны ў гарах Швейцарыі, Аляксандр Суворaў вядзе за сабой армію на вялікую бітву. Ён натхняе воінаў на будучае змаганне.

У поўны рост адлюстраваў на партрэце прадстаўніцу шляхетнага роду невядомы мастак. Асаблівую ўвагу майстар звярнуў на паставу і шыкоўны строй Франці́шкі Уршу́лі Радзівіл. Прыцягнуць погляд да выявы вядомага дзеяча культуры мастаку дапамог буйны план і мінімальная колькасць дэталяў. Большую частку палатна заняла постаць Францішкі Уршулі. На аднастайным



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

карычневым фоне яркай плямай майстар вылучыў пышны ўбор. А вогненныя драпіроўкі, нібы арэол, атачылі яе выразны стан.

Французскі скульптар Эцьен Марыс Фальканэ стварыў арыгінальны партрэтны вобраз імператара Пятра I. Назву «Медны коннік» помнік атрымаў дзякуючы аднайменнай паэме Аляксандра Пушкіна. У адрозненне ад большасці партрэтаў імператараў, створаных у XVIII стагоддзі, Эцьен Марыс Фальканэ адлюстроўвае цара ў свабоднай вопратцы, якая нагадвае і старажытнарымскі, і традыцыйны рускі касцюмы. Скульптар засяродзіў увагу на паставе Пятра I у сядле ўзнятага на дыбкі каня, які стаіць на вяршыні скалы. Упэўненая, гордая постаць імператара адлюстроўвае царскую волю, магутнасць, рашучасць.

Гісторыю пра полацкую княжну Рагнéду і яе сына Ізяслáва адлюстраваў у бронзавай скульптуры беларускі майстар Анатоль Арцімовіч. Легендарныя вобразы жонкі кіеўскага князя Уладзіміра і іх сына, які мужна бараніў Рагнеду ад смерці, сталі адным з сімвалаў Заслаўя. У двухфігурнай кампазіцыі скульптар адлюстраваў і процiборства, і пакорлівасць. Далікатнаму вобразу босай маці, пазбаўленай эмоцый, супрацьстаіць валявы, ваяўніча настроены вобраз яе сына.



**Эцьен Марыс Фальканэ.**
Медны коннік
(Расія)



**Анатоль Арцімовіч.**
Помнік Рагнедзе
і Ізяславу
(г. Заслаўе, Беларусь)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Сяргей Селіханаў.**
Нескароны чалавек
(в. Хатынь, Лагойскі р-н, Беларусь)

Сілу духу, стойкасць і мужнасць беларускага народа па-майстэрску перадаў у манументе «Нескароны чалавек» мемарыяльнага комплексу «Хаты́нь» скульптар Сяргей Селіха́наў. Аўтар манумента паказаў жахлівыя эмоцыі бацькі, які трымае сына, памерлага ў яго на руках.

Уварваўшыся ў вёску, фашысцкія захопнікі сагналі ўсіх жыхароў Хатыні ў гумно і падпалілі яго. У страшным полымі зажыва згарэлі мірныя людзі. Ацалелі толькі некалькі чалавек: дзве дзяўчыны, два хлопчыкі і адзін мужчына — каваль Іосіф Камі́нскі. Менавіта яго вобраз застаўся ў бронзе на стагоддзі як сімвал непераможнасці і адвагі чалавека перад жорсткасцю вайны.

Кіраўнікі дзяржаў, палкаводцы, дзеячы культуры і звычайныя людзі... Мастакі часта прысвячаюць ім шматлікія творы. А мы дзякуючы майстрам мастацтва можам больш даведацца пра гісторыю, у тым ліку пра гісторыю свайго роднага краю.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад гістарычных партрэтаў, прадстаўленых у параграфе і электронным дадатку. На якія чалавечыя якасці гістарычных асоб звярнулі ўвагу майстры мастацтва?

2. Разгледзьце манумент «Нескароны чалавек». Чаму скульптар даў помніку менавіта такую назву? Складзіце спіс слоў, якія характарызуюць вобраз, адлюстраваны ў скульптуры.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Гістарычныя падзеі з’яўляюцца часткай жыцця сучасных людзей. Цікавыя мерапрыемствы, навуковыя сенсацыі, мастацкія адкрыцці,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

спартыўныя дасягненні... Сёння мы штодня сутыкаемся з разнастайнасцю інфармацыі, якая хуткім часам стане часткай гісторыі. Падумайце і самастойна зрабіце высновы па тэме параграфа згодна з планам:

- Назавіце імёны гістарычных асоб, чые здзяйсненні вам цікавыя.
- Пералічыце імёны сучаснікаў (навукоўцаў, дзеячаў культуры, спартсменаў і інш.), учынкі якіх выклікаюць у вас павагу.
- Назавіце гістарычныя падзеі, якія вы хацелі б убачыць у творах мастацтва.
- Якім гістарычным асобам вы паставілі б помнік у вашым горадзе, пасёлку? Чаму? Якое значэнне ў гісторыі вашага рэгіёна маюць выбраныя вамі героі?
- Выканайце эскіз гэтага помніка алоўкам. Дзе б вы размясцілі манумент?

## § 8. ЧАЛАВЕК І ПРАЦА

Праца ўпрыгожвае чалавека. Чалавек, які якасна выконвае працу, заслугоўвае павагі і пашаны. Адказны чалавек творыць дабро. Бо ад таго, як будзе зроблена яго праца, часта залежаць лёсы іншых людзей.

Тэма працы ў мастацтве цесна звязана з адлюстраваннем людзей розных прафесій. Але мастак не проста паказвае нам працоўнага чалавека, ён надае ўвагу абставінам і прыладам працы. А вось партрэтныя рысы чалавека — твар, міміка — нярэдка адыходзяць на другі план.



**Гюстаў Курбэ.** Драбільшчыкі камянёў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Жан-Франсуа Міле.**
Зборшчыцы каласоў

Французскі мастак Гюста́ў Курбэ́ ў карціне «Драбільшчыкі камянёў» адлюстраваў рабочых асаблівым чынам. Ён наўмысна не паказаў іх твары, каб прыцягнуць увагу гледачоў да цяжкай працы каменячосаў. У цэнтры ўвагі мастака — дзве фігуры. Гэта стары і юнак, якія здабываюць каменне для будаўнічых работ. Яны паказаны буйным планам, у паношанай вопратцы. Іх мускулістыя рукі і загарэлая скура сведчаць пра тое, што мужчыны ўжо доўгі час працуюць пад пякучым сонцам, не шкадуючы сіл. Стары, які сагнуўся,



**Міхаіл Сеўрук.**
Жніво



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Андрэй Курнакоў.** Адказныя за жыццё (фрагмент)

замахваецца малатком, падрыхтаваўшыся зрабіць удар па гары камянёў. Малады мужчына нясе кошык са шчэбнем.

Карціна «Зборшчыцы каласоў» французскага мастака Жа́на-Франсуа́ Міле́ прысвечана сельскім працаўнікам. Тры сялянкі, схіліўшыся над прыбраным полем, збіраюць пакінутыя каласкі. Ад колькасці сабраных каласоў залежыць, хопіць іх сем'ям хлеба да новага ўраджаю або іх чакае галодны год.

Мастак не выпадкова абраў такія складаныя павароты фігур — мы не бачым твары жанчын, але добра адчуваем увесь цяжар іх працы. Сялянкі паказаны буйным планам на фоне сельскага пейзажу. Недзе ўдалечыні, сярод стагоў, жняцы адпраўляюць павозку з багатым ураджаем. Іх праца таксама важная, але яна не такая цяжкая.

А вось перад намі карціна-аповед мастака Міхаіла Се́ўрука «Жніво». Сярод залітых сонцам палёў жняцы займаюцца зборам ураджаю. Мужчына і жанчына збіраюць калоссе ў снапы. Крыху далей — двое мужчын паспешліва вязуць на павозцы сабраны ўраджай. У цэнтры карціны — маці, якая корміць немаўля. Тут жа, пад шатамі велічных дубоў, адпачываюць касцы. Малы забаўляецца з сабакам. Усе захоплены сваёй справай. Праца на радасць...

Прафесіі ўрача прысвечана карціна «Адказныя за жыццё» рускага мастака Андрэя Курнакова. Партрэтныя вобразы ўрачоў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

дакладна перадаюць карціну рэальнага жыцця. Хірургі ўнутрана напружаны, сабраны перад будучай аперацыяй. Яны засяроджана рыхтуюцца да выратавання чалавечага жыцця — галоўнай каштоўнасці свету.

Мастакі ў сваёй творчасці падрабязна расказваюць нам пра жыццё чалавека. Мы даведваемся пра яго майстэрства, таленты і прафесійныя якасці.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Уважліва разгледзьце творы, прадстаўленыя ў параграфе і электронным дадатку. Якія пачуцці яны ў вас выклікаюць? Чаму?

2. Вы пазнаёміліся з творамі мастацтва, у якіх паказана, чым займаюцца людзі розных прафесій. А якая прафесія цікавая вам? Чаму? Вусна складзіце слоўны партрэт чалавека той прафесіі, якая вам падабаецца.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. У гісторыі многіх прафесій немалаважную ролю адыгрывалі музычныя інструменты. Напрыклад, сярэднявечныя паштары паведамлялі пра сваё прыбыццё ў горад з дапамогай ражка.
Гэты інструмент не выпадкова прысутнічае ў эмблеме пошты ў многіх краінах свету, у тым ліку і ў Беларусі.

Падрыхтуйце для сяброў паштоўку: на адным яе баку намалюйце атрыбут прафесіі, якая вам падабаецца, на другім — напішыце, чаму вам гэта прафесія падабаецца. У вас атрымаецца сапраўдная ілюстраваная паштоўка, папулярная ў мінулым стагоддзі.

## § 9. ТВОРЧЫ ЎРОК. ЖЫВЫЯ КАРЦІНЫ...

У розных відах мастацтва для стварэння партрэта выкарыстоўваюцца асаблівыя сродкі мастацкай выразнасці. У жывапісным партрэце важныя колеравыя плямы. Слоўны партрэт дазваляе разгледзець усе грані знешняга і ўнутранага аблічча чалавека. Музычны партрэт



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з дапамогай гукаў яскрава выяўляе пачуцці і эмоцыі чалавека. А праз унутраны стан чалавека мы «дамалёўваем» яго знешні выгляд. Складаная задача, ці не так?

Вобраз жанчыны-рукадзельніцы выклікаў цікавасць многіх майстроў мастацтва. Верагодна, таму, што рукадзелле — прадзенне, ткацтва, шыццё, вязанне — з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця чалавека. Напрыклад, верацяно і калаўрот у хатах нашых продкаў былі аднымі з самых неабходных прадметаў побыту.

Яркія вобразы юных дзяўчат, якія працуюць на калаўроце, стварылі многія мастакі і кампазітары. Калаўрот — гэта прылада працы, пры дапамозе якой скручвалі і намотвалі на верацяно ніткі ў час прадзення. У мінулым лічылася, што з ніткі вытканы чалавек і ўсё, што яго акружае.

Песня «Пра́лля» (музыка Стані́слава Маню́шкі, словы Я́на Чачота) — жывая музычная карцінка. Гукі кручэння верацяна добра чутныя ў акампанеменце — музычным суправаджэнні вакальнай партыі. У інфармацыйных крыніцах паслухайце твор некалькі разоў. Звярніце ўвагу, як акампанемент уплывае на стварэнне вобраза гераіні. Паспрабуйце нягучна «прагудзець» партыю верацяна, стварыўшы новы акампанемент да песні.



**Іван Казакоў.**
Пралллі (фрагмент)

ПРАСНІЧКА

Гожыя дзяўчаткі
Ля праснічак селі —
Тоненькія ніткі
Цягнуцца з кудзелі.
Віся, вераценца,
Віся, ды барджэй!
Доўга тая любіць,
Дзе нітка даўжэй.

*Ян Чачот*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ніткі таксама могуць стаць матэрыялам для будучага мастацкага твора. Пафантазіруйце і выканайце з дапамогай нітак арыгінальную аплікацыю:

- падрыхтуйце загадзя ніткі markup рознай даўжыні, рознага колеру, рознай таўшчыні;
- размясціце іх на каляровым аркушы паперы ў выглядзе якой-небудзь з’явы або прадмета (дрэва, сонца, кветкі, вазы з кветкамі) або раскідайце на паперы адвольна, мудрагеліста;
- калі вам спадабалася ваша карціна, акуратна прыклейце ніткі да паперы;
- раскажыце, што ў вас атрымалася. Прыдумайце для вашай карціны-аплікацыі арыгінальную назву.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 5

НАВАТ У НАЙПРЫГАЖЭЙШЫХ СВАІХ МАРАХ ЧАЛАВЕК НЕ МОЖА ЎЯВІЦЬ НІЧОГА БОЛЬШ ЦУДОЎНАГА ЗА ПРЫРОДУ.
*Альфонс дэ Ламарцін*

# СВЕТ ПРЫРОДЫ Ў МАСТАЦТВЕ



**Валяр'яна Жолтак.** Званочкі лясныя

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 10. СВЕТ ПРЫРОДЫ Ў МАСТАЦТВЕ — ГЛЯДЗІМ І СЛУХАЕМ

Са старажытных часоў прыродны свет выконвае важную ролю ў жыцці чалавека. Чалавек вучыцца ў прыроды, як правільна жыць. Ён уладкоўвае жыллё, вынаходзіць складаныя механізмы і прадметы, абапіраючыся на тыя веды, якія дае яму прырода. Ідэі многіх найвялікшых твораў чалавека «падгледжаны» ў прыродным свеце — свеце складаным, багатым, на дзіва шчодрым, часам непрадказальным і небяспечным. Багаты і разнастайны ў сваіх праявах прыродны свет з’яўляецца для чалавека ўзорам дасканаласці і прыгажосці.

**Пейза́ж** — жанр у мастацтве, прысвечаны адлюстраванню прыроды.

Веліч і чароўнасць прыроды ва ўсе часы імкнуліся адлюстраваць у сваіх творах мастакі і скульптары, паэты і празаікі, кампазітары і дойліды. Малюючы свет прыроды, майстры мастацтваў увасаблялі ў творах свае ўражанні, эмоцыі і перажыванні. Прыгажосць і разнастайнасць фарбаў зямлі, бязмежных палёў і лясоў, глыбіня азёр і рэк, бяздоннасць мора і неба перадаюцца ў творах мастацтва заўсёды па-рознаму. І перад намі — гледачамі, слухачамі, чытачамі — узнікаюць разнастайныя вобразы. Светлыя, таямнічыя, маўклівыя, далікатныя, загадкавыя...



**Іван Шышкін.** Карабельны гай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Пейзажам* прысвяціў сваё жыццё рускі мастак Іван Шы́шкін. На яго карціне «Карабельны гай» тонка і выразна прарысаваны пышныя кроны магутных соснаў, патрэсканая кара іх ствалоў, парослыя мохам берагі ручая з чыстай празрыстай вадой, векавыя камяні на пясчанай водмелі, азораны сонцам узлесак. Гульня святла і ценю, цёплыя тоны — і перад намі ажывае карціна лета ў сасновым лесе. А цяпер паспрабуем прыслухацца да гэтай карціны: мяккае цурчанне ручая, лёгкі шэпт стомленых ад спёкі дрэў, глыбокія ўздыхі векавых камянёў...

Асаблівы погляд на з'явы прыроды прадстаўлены ў працы «Квітнеючыя галінкі міндаля» мастака Вінцэнта Ван Гога. У адрозненне ад летніх фарбаў на карціне Івана Шышкіна, тут жывапісец стварае яркі вясновы каларыт. Асаблівую ўвагу ён надае *колеравай гаме*. Халодныя адценні і падрабязнае прарысоўванне кветак міндаля ствараюць у гледача адчуванне, што ён назірае за вясновым абуджэннем прыроды. І зноў прыслухаемся да карціны. Звонкае, амаль празрыстае паветра, лёгкае пакалыхванне галінак, ласкавае трапятанне кветак міндальнага дрэва выклікаюць у нас прыемныя адчуванні вясновай свежасці і радасці жыцця.

Свет прыроды знаходзіць сваё ўвасабленне не толькі ў жанры пейзажа. Для многіх мастакоў любімым жанрам з'яўляецца *нацюрморт*. У нацюрмортах яны малююць самыя розныя прадметы — кветкі, плады, прыгожы посуд. А часам уключаюць у кампазіцыю выявы жывёл або чалавека.



**Вінцэнт Ван Гог.**
Квітнеючыя галінкі міндаля



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Іван Хруцкі.**
Нацюрморт з птушачкай

Напрыклад, карціна «Нацюрморт з птушачкай» беларускага мастака Івана Хруцкага захапляе багаццем праяў прыроды, сабраных у адной кампазіцыі. Ствараючы нацюрморты, мастак дапаўняў іх незвычайным элементам. На гэтай карціне мы бачым невялікую птушачку, якая ажыўляе агульны настрой.

У іншай манеры выкананы нацюрморт «Персікі і грушы» французскага жывапісца Поля Сеза́на. Грушы, злёгку нахіленая талерка з персікамі, збан для малака, змяты абрус перададзены крыху спрошчана. Гэта дазваляе адчуць не толькі форму прадметаў, але і разнастайнасць іх адценняў.

**Нацюрморт** — гэта адлюстраванне неадушаўлёных прадметаў у мастацтве.



**Поль Сезан.**
Персікі і грушы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прырода зачароўвае мастакоў сваёй дасканаласцю. Пры дапамозе фарбаў, формаў, рытмаў і гукаў чалавек спрабуе наблізіцца да яе, каб зразумець. Дзякуючы мастацтву мы можам па-новаму ўбачыць свет прыроды і здзівіцца прыгажосці таго, што ўчора здавалася звыклым і будзённым.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Уважліва разгледзьце пейзажы і нацюрморты, прадстаўленыя ў параграфе і электронным дадатку. Што, на ваш погляд, з'яўляецца самым важным у адлюстраванні прыроды? Прыдумайце свае назвы да работ мастакоў.

2. Прыслухайцеся да прыроднага свету, які вас акружае, — на прагулцы, у падарожжы, на адпачынку. Свет гучыць разнастайна. Складзіце невялікае вуснае апавяданне пра гукі прыроды (музыку дажджу, шолах лістоты і інш.).

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Выканайце нацюрморт-рэбус на тэму восені (зімы, вясны, лета), выкарыстоўваючы любыя прадметы, якія сугучныя абранай вамі пары года. Сфатаграфуйце яго і пакажыце аднакласнікам. Прапануйце ім адгадаць, якая пара года «хаваецца» ў нацюрморце.

## § 11. ЯКІ НАСТРОЙ У ПРЫРОДЫ?

Чаму мы часта кажам пра прыроду нібы пра нешта адушаўлёнае? Ці знаёмыя вам выразы «дождж плача», «сонца ўсміхаецца», «лісце шапоча», «вецер вые», «снег рыпіць»? Магчыма, прыродны свет сапраўды жывы і ў яго можа быць свой настрой? Паспрабуем правесці даследаванне, надаўшы ўвагу адной пары года — *восені*.

Восень... Якая яна? Залатая, яркая, вясёлая? Або ціхая, сумная, дажджлівая? Восень — розная... І мастакі імкнуцца прыкмеціць і адлюстраваць усе яе фарбы. Давайце разам разгледзім працы жывапісцаў, якія прысвечаны восені, і паразважаем пра настрой, які перадаюць палотны.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Ісак Левітан.**
Залатая восень

На карціне «Залатая восень» мастака Іса́ка Леві́тана мы бачым аблашчаную восеньскім сонцам прыроду: кроны нераўнамерна пажоўклых дрэў, раку, у якой адлюстроўваецца па-асенняму яркае неба, лёгкія святочныя аблокі.

Беларускі мастак Леанід Шчамялёў па-свойму бачыць восень і перадае яе характар яркімі фарбамі, нанесенымі густымі мазкамі. Два восеньскія пейзажы і два цалкам розныя настроі.

У вершы «Восень» расійскай паэтэсы Галіны Га́мпер галоўным персанажам з'яўляецца клён. Клён параўноўваецца з клоўнам, які зайшоў у госці да чалавека і выратаваў яго ад восеньскай тугі. Паглядзіць чалавек на вясёлага рыжага клоўна — і яму будзе ўжо не так сумна.

**Осень**

На лесные продрогшие склоны,
Презирая дожди и слякоть,
Вышел клён, вышел рыжий клоун
В самый раз, когда надо плакать.

Он так ловко от солнца зажмурился,
Притворился таким повесой.
Неудобно нам стало хмуриться
Или просто сделалось весело?

Он прошёл колесом оранжевым,
Он нам листья швырнул на счастье.
И не поняли мы ни разу,
Что ведь вышел-то он прощаться.

*Галіна Гампер*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Леанід Шчамялёў.**
Восень пад Мінскам

Разнастайныя восеньскія настроі паказаны ў цыкле «Поры года» рускага кампазітара Пятра Чайкоўскага. Цыкл складаецца з дванаццаці фартэпіянных п'ес, кожная з якіх прысвечана аднаму месяцу.

«Поры года» Пятра Чайкоўскага часта называюць «энцыклапедыяй пейзажа». У п'есах тонка паказаны прыгажосць прыроды, жыццё людзей з іх звычаямі, традыцыямі, святамі. Восені прысвечаны тры п'есы: «Верасень. Паляванне», «Кастрычнік. Восеньская песня» і «Лістапад. На тройцы», і да кожнай прапанаваны эпіграф. Гэта паэтычныя радкі з вершаў рускіх паэтаў. Эпіграфы дапамагаюць нам, слухачам, улавіць тонкія адценні настрою музычнага пейзажа.

**Сентябрь. Охота**

Пора, пора! Рога трубят:
Псари в охотничьих уборах
Чем свет уж на конях сидят;
Борзые прыгают на сворах.

*Аляксандр Пушкін*

**Октябрь. Осенняя песнь**

Осень, осыпается
весь наш бедный сад,
Листья пожелтевшие
по ветру летят...

*Аляксей Талстой*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Эцьен Марыс Фальканэ.**
Зіма

**Ноябрь. На тройке**

Не гляди же с тоской на дорогу
И за тройкой вослед не спеши,
И тоскливую в сердце тревогу
Поскорей навсегда заглуши!

*Мікалай Някрасаў*

У скульптуры прыродны свет паказаць нашмат больш складана. Як перадаць настрой і характар прыроды з дапамогай матэрыялаў скульптара — каменю, дрэва, бронзы? Але майстры знайшлі выйсце, прапанаваўшы выразны прыём — *алегорыю*. Яркім прыкладам алегорыі з'яўляецца скульптурная кампазіцыя «Зіма» Эцьена Марыса Фальканэ. Зіму майстар выявіў у вобразе юнай прыгажуні, якая крысом плашча клапатліва прыкрывае далікатныя кветкі ад марознага дыхання сцюжы.

**Алегорыя** — гэта іншасказанне, паказ нейкай з'явы праз вядомы вобраз.

Пасля восені нязменна прыходзіць зіма. І закруціўся, завярцеўся кругаварот прыроды! Вясновае абуджэнне, яркія летнія фарбы і зноў восеньскае завяданне... Але кожны перыяд — гэта новы стан, а значыць, новы настрой прыроды. Разгадаць і адлюстраваць гэтыя настроі ў сваіх творах імкнуцца многія мастакі.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Кожная пара года цудоўная па-свойму. Што асабліва цікавага вы бачыце ў вясновым, летнім, восеньскім і зімовым пейзажах, з якімі пазнаёміліся ў параграфах 10–11 і электронным дадатку? Чым



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

адрозніваюцца творы мастацтва, якія адлюстроўваюць настрой кожнай пары года? Падбярыце як мага больш слоў-эпітэтаў, якія характарызуюць настрой вясны, лета, восені, зімы.

2. Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах п’есу «Кастрычнік. Восеньская песня» Пятра Чайкоўскага. Апішыце сродкі музычнай выразнасці — мелодыю, рытм, тэмп, тэмбр, сілу гучання, выкарыстоўваючы сродкі выразнасці выяўленчага мастацтва. Напрыклад: насычана жоўтая мелодыя, бледна-блакітны рытм, ярка-сіні тэмбр і г. д.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Выканайце малюнак «Восень у маім горадзе (пасёлку)». Больш эмацыянальна перадаць настрой восеньскай прыроды вам дапаможа музычны фон з твораў беларускага кампазітара Валерыя Карэ́тнікава (п’есы «Верасень. Адлятаюць птушкі», «Кастрычнік. Залатая восень» з сюіты «Поры года» — гл. інфармацыйныя крыніцы).

## § 12. ЯКІ Ў ПРЫРОДЫ ХАРАКТАР?

Чатыры асноўныя прыродныя стыхіі — *вада*, *паветра*, *зямля* і *агонь* — пачатак усяго жывога на планеце. Усе яны аднолькава прывабныя для мастакоў, аднолькава часта характар кожнай са стыхій увасоблены ў творах мастацтва.



**Іван Айвазоўскі.** Марскі бераг. Развітанне



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Рускі мастак Іван Айвазоўскі ўсё сваё жыццё прысвяціў стварэнню марскіх пейзажаў — *марын*. І мора ў яго заўсёды рознае. Кожная карціна мастака — гэта адлюстраванне пэўнага характару марской стыхіі.

**Мары́на** — від пейзажа з выявай мора.

На карціне «Марскі бераг. Развітанне» мы бачым раніцу, штыль, павольнае развітанне сям'і і шлюпку, якая чакае вандроўніка. Крыху далей — сілуэт двухмачтавага судна. Спакойная роўнядзь мора абяцае шчаслівае плаванне. Цішыня і спакой...

На карціне «Чорнае мора» ўвасоблены іншы вобраз марской стыхіі. Па-майстэрску перададзены рух хваль. З кожнай новай хваляй узмацняецца жаданне схавацца. Мора амаль зліваецца са змрочным небам — і дзесьці вельмі далёка губляецца ледзь улоўны сілуэт карабля.

Вобраз мора ўзнікае ва ўяўленні пры слуханні сімфанічнай сюіты «Шахераза́да» Мікалая Рымскага-Корсакава. Гэтак жа, як і на карцінах Івана Айвазоўскага, у музычным творы адноўлены настрой і характар марской стыхіі.

Слухаючы першую частку сюіты «Мора і Сіндба́даў карабель», мы ўяўляем спакойнае мора. Мірна калышуцца хвалі, а на хвалях мерна пакалыхваецца ў чаканні новых прыгод карабель. Зусім іншы настрой мора ў чацвёртай частцы сюіты — «Свята ў Багда́дзе». У музыцы чуюцца трывожныя ноткі, якія прадвяшчаюць трагедыю. Карабель нясецца па хвалях, нястрымна набліжаючыся да сваёй пагібелі. Парусн ік разбіваецца аб скалы.



**Клод Манэ.**
Гарлачыкі

Французскі мастак Клод Манэ́ ў рабоце «Гарлачыкі» намаляваў сажалку сваёй сядзібы. Вясёлкавыя плямы далікатных кветак ажыўляюць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

карціну. Ствараецца ўражанне, нібыта сажалка дзякуючы іскрыстым фарбам гарлачыкаў расцвітае. Дрэвы і неба, адлюстраваныя ў вадзе, толькі адцяняюць іх яркасць і свежасць, ствараючы радасны, узнёслы настрой.

Прыгажосць рускай прыроды ўславіў у сваёй творчасці рускі кампазітар Сяргей Рахмáнінаў. Усхваляванасць і ў той жа час ціхамірнасць, празрыстасць і далікатнасць адчуваюцца ў гуках прэлюдыі соль-дыез мінор. Слухаючы музыку, мы нібыта бачым дарагія кампазітару карціны рускага пейзажу: бязмежныя стэпы, задумлівыя лясы і шырокія рэкі. На пытанне «Што такое музыка?» Сяргей Рахманінаў, знаходзячыся ўдалечыні ад радзімы і сумуючы па ёй, адказаў: «Гэта ціхая месячная ноч. Гэта шолах жывой лістоты. Гэта аддалены вячэрні звон. Гэта тое, што нараджаецца ад сэрца і ідзе да сэрца».

Захапленне роднай прыродай перадаў у карціне «Азёрны край» беларускі мастак Павел Мáсленікаў. Перад намі мілая сэрцу мастака прастора бяскрайніх азёр, акружаная багатай раслліннасцю. Нізкая лінія гарызонту кліча ўдалечыню. Дзесьці там шапка лесу хавае ад нас свае таямніцы. Спераду раскінулася возера. Лёгкая рабізна на вадзе адлюстроўвае мудрагелістыя формы пульхных аблокаў. Свежы ветрык цёплым подыхам ахутвае дрэвы ля берагоў вадаёма.



**Павел Масленікаў.**
Азёрны край



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Іх лістота, палаючая іскрыстымі фарбамі, перадае кожнай травінцы на лузе сум з нагоды заканчэння лета. На палатне — цудоўны куток беларускай прыроды.

Майстры мастацтва ў сваёй творчасці апяваюць прыгажосць і непаўторнасць роднага краю, ганарацца ім і адначасова перажываюць за яго будучыню.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Што, на ваш погляд, вабіць майстроў мастацтва ў жанрах пейзажа і нацюрморта? Якія магчымасці гэтыя жанры даюць майстрам? Адказваючы на пытанне, выкарыстоўвайце мастацкія прыклады з параграфаў і электроннага дадатку.

2. Параўнайце вобразы мора на карцінах Івана Айвазоўскага, змешчаных у параграфе і электронным дадатку, і ў сімфанічнай сюіце «Шахеразада» Мікалая Рымскага-Корсакава. Чым падобныя і чым адрозніваюцца вобразы марской стыхіі ў розных відах мастацтва?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Выканайце некалькі фотапейзажаў, якія перадаюць розныя настрой і характар прыроды. Вы можаце прапанаваць пейзажы, сфатаграфаваныя ў розных месцах. А можна паказаць зменлівы настрой прыроды, калі на працягу некалькіх дзён у розны час сутак здымаць адзін і той жа краявід. Пастарайцеся перадаць у работах уласнае стаўленне да прыроднага свету. Пакажыце фотаздымкі аднакласнікам, растлумачце сваю задуму.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 6

ІШОЎ БАЙ ПА СЦЯНЕ
У ЧЫРВОНЫМ ЖУПАНЕ.
НЁС СЯМЁРА ЛАПЦЕЙ:
І ЖАНЕ, І САБЕ,
І ДЗІЦЁНКУ ПА ЛАПЦЁНКУ.
БАІЦЬ КАЗКУ ЦІ НЕ?..

*З беларускага фальклору*

# У СВЕЦЕ КАЗАК



**Валерый Славу́к.** Бай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 13. ШТО ТАКОЕ КАЗКА?

*«Калісьці, даўным-даўно, не за нашай памяццю, можа, яшчэ і бацькоў і дзядоў нашых не было на свеце, жылі-былі…»* Прыблізна так *казачнікі* пачынаюць большую частку *казак* — пра чараўнікоў і пачвар, прынцаў і прынцэс, пра розныя цудоўныя падзеі. І, вядома ж, пра перамогу дабра над злом.

**Ка́зка —** твор чароўнага, фантастычнага характару, звычайна са шчаслівым канцом.
**Ка́зачнік —** стваральнік і апавядальнік казак.

Галоўная асаблівасць любой казкі — выдуманыя сюжэт, героі і падзеі. Калабка, Сынка-з-кулачок, Змея Гарыныча ці Жар-птушкі не існуе. Няма ў рэальнасці дывана-самалёта, ботаў-скараходаў або абруса-самабора. Усе гэтыя героі і прадметы «ажываюць» толькі ў казцы і дзякуючы казцы.

Але на самай справе казка — гэта самы *праўдзівы* жанр у мастацтве!

У ***чарадзейных казках*** з героямі адбываюцца разнастайныя цуды. Напрыклад, Іванка-дурань у казках умее граць на музычных



**Іван Білі́бін.**
Ілюстрацыя да казкі «Іван-царэвіч і Жар-птушка»



**Мікалай Качаргі́н.**
Ілюстрацыя да казкі Пятра Яршова «Канёк-гарбунок»



**Галіна Які́мава.**
Фарфоравая статуэтка «Іван з Жар-птушкай»



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

інструментах, размаўляць з жывёламі, сонцам і ветрам. Ён знаходзіць агульную мову нават з Бабай-ягой!

Вот полночною порой
Свет разлился над горой,
Будто полдни наступают:
Жары-птицы налетают;
Стали бегать и кричать
И пшено с вином клевать...
...Сам с собою, под лазейкой
Наш Иван ужом да змейкой
Ко пшену с вином подполз —
Хвать одну из птиц за хвост.
«Ой! Конёчек-горбуночек!
Прибегай скорей, дружочек!
Я ведь птицу-то поймал!» —
Так Иван-дурак кричал.

*Пётр Яршоў. Канёк-гарбунок*

На самай жа справе Іван зусім не дурань. Прыгледзьцеся да яго ўчынкаў больш уважліва. Ён добры, смелы і знаходлівы. Трапляючы ў розныя складаныя сітуацыі, Іван з імі спраўляецца. Ён можа лёгка злавіць Жар-птушку ці Сіўку-Бурку, пралезці праз вуха каня і нават акунуцца ў гарачае малако. Вядома, не абыходзіцца без чарадзейных памочнікаў.

**Увасаблéнне** — гэта прыпісванне неадушаўлёным прадметам якасцей жывых істот.

***Казкі пра жывёл***, хутчэй за ўсё, з'явіліся тады, калі асноўным рамяством чалавека было паляванне і калі ён стаў прыручаць дзікіх жывёл. Гэта і знайшло адлюстраванне ў народнай творчасці.

Людзі надзялялі жывёл чалавечымі якасцямі — дабрынёй, хітрасцю, кемлівасцю, глупствам. Напрыклад, ліса ў казках часцей за ўсё хітрая, каварная і пранырлівая. Воўк — дурны і прагны. Зайца народ адлюстраваў у казках баязлівым, казу і быка — упартымі, а мядзведзя — моцным.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Валерый Славу́к.**
Лісіца і воўк. Ілюстрацыя да «Казкі пра мядзведзя» Максіма Танка

Лісічка села на спіну ваўка, ён яе і панёс.

Вось лісічка-сястрычка сядзіць ды паціху і кажа:

— Біты нябітага вязе, біты нябітага вязе.

— Што ты, кумка, кажаш?

— Я, куманёк, кажу: біты бітага вязе.

— Так, кумачка, так!..

*Лісічка-сястрычка і Шэры воўк*
*Руская народная казка*

Вось як хітрая і кемлівая ліса падманула ваўка! А ён, змерзлы і галодны, цягне на сабе сытую і задаволеную хітруху.

У казках пра жывёл мы сустракаемся з самымі рознымі якасцямі чалавека — адвагай, дабрынёй, смеласцю, подласцю, хітрасцю.

***Казкі з выдуманымі героямі*** — Кашчэем Несмяротным, Змеем Гарынычам, Бабай-ягой — асабліва яркія і запамінальныя. Часам героямі казак з'яўляюцца чарадзейныя прадметы — люстэрка, шапка-невідзімка, жывая вада.



**Арцемій Обер.**
Баба-яга

З усіх казачных герояў майстрам мастацтва асабліва спадабаўся вобраз Бабы-ягі. Ён шматгранна ўвасоблены ў мастацкіх творах. У скульптурнай выяве Арцемія Обера Баба-яга глядзіць на нас злосна, нядобрымі вачыма. Яе суровая знешнасць палохае. Што задумвае яна, сашчапіўшы рукі на грудзях?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ярка і выразна раскрыў вобраз Бабы-ягі кампазітар Мадэ́ст Му́саргскі ў музычнай п'есе «Хатка на курыных лапках». Рэзкія скачкі ў мелодыі, незвычайнае спалучэнне гукаў, хуткая змена тэмпу ствараюць імітацыю вядзьмаркі, якая ляціць у ступе.

Зусім іншую Бабу-ягу мы сустракаем у мастацкім фільме «Марозка» рэжысёра Аляксандра Роў і мультфільме «Лятучы карабель» рэжысёра Га́ры Ба́рдзіна. Баба-яга губляе свой страшны вобраз: яна дапамагае галоўнаму герою, весяліцца, радасна спявае прыпеўкі і нікога не збіраецца крыўдзіць.

Баба-яга бывае розная. Яе ўчынкі незвычайныя і супярэчлівыя. Менавіта гэта і прыцягвае майстроў мастацтва.

Прыгажосць і цяпло казкі ўніверсальныя. Яе мову разумеюць усе людзі на планеце. Казка нясе нам радасць і ўпэўненасць, нешта вельмі важнае... Разгледзець гэта важнае дапамагаюць нашы фантазія і ўяўленне.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Пазнаёмцеся з мастацкімі вобразамі Бабы-ягі ў параграфе і электронным дадатку. Навошта сучаснаму чалавеку патрэбна казка? Як вы думаеце, чаму казкі любяць не толькі дзеці, але і дарослыя?

2. Паслухайце ў электронным дадатку фартэпіянную п'есу «Хатка на курыных лапках» Мадэста Мусаргскага. Якую ролю ў стварэнні вобраза Бабы-ягі адыгрываюць рытм і тэмп? Абмяркуйце з аднакласнікамі, як мяняецца эмацыянальны стан персанажа на працягу п'есы. А як змяняліся вашы эмоцыі?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фрагменты з фільмаў «Марозка» рэжысёра Аляксандра Роў, «Канёк-гарбунок» Івана Іванова-Вано ці «Лятучы карабель» Гары Бардзіна. Намалюйце або складзіце і сфатаграфуйце нацюрморт-рэбус, уключыўшы ў яго прадметы, якія належаць аднаму з герояў упадабанага вамі фільма. Прапануйце сябрам разгадаць прыдуманы вамі рэбус. Ці пазналі яны ў вашай рабоце героя карціны, саму карціну? Калі не пазналі, то чаму?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 14. КАЗАЧНЫ ВОБРАЗ У МАСТАЦТВЕ

Казкі выклікаюць цікавасць, абуджаюць добрыя пачуцці і эмоцыі. Магчыма, менавіта таму многія мастакі з такім задавальненнем і, галоўнае, павагай звяртаюцца да казачных сюжэтаў і герояў. Жыццё казкі не спыняецца ніколі!

І ўсё ж сярод мноства казак ёсць асаблівыя. Іх сюжэты мы пазнаём адразу — па першым слове, па знаёмым радку, па імёнах герояў. Менавіта такой казкай з'яўляецца «Казка пра цара Салтана...».

Аляксандр Пушкін быў захоплены народнай казкай пра цудоўную Царэўну Лебедзь і на аснове яе сюжэта стварыў новы паэтычны вобраз. Гісторыю Пушкіна пра Царэўну Лебедзь можна расказаць з дапамогай унікальных кніжных ілюстрацый. Адным з лепшых ілюстратараў рускіх казак быў Іван Білібін. Ён працаваў у вельмі выразнай і пазнавальнай манеры. Вобразы, створаныя ім да казак Аляксандра Пушкіна, перадаюць атмасферу даўніны і чароўнага свету.



**Аляксандр Ку́ркін.**
Ілюстрацыя да
«Казкі пра цара Салтана…»

…«Да на свете,
Говорят, царевна есть,
Что не можно глаз отвесть.
Днём свет божий затмевает.
Ночью землю освещает —
Месяц под косой блестит,
А во лбу звезда горит.
А сама-то величава,
Выступает, будто пава;
Сладку речь-то говорит,
Будто реченька журчит.
Только, полно, правда ль это?»
Князь со страхом ждёт ответа.
Лебедь белая молчит
И, подумав, говорит:
«Да! Такая есть девица»...
...Лебедь тут, вздохнув глубоко,
Молвила: «Зачем далёко?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Знай, близка судьба твоя,
Ведь царевна эта — я».
Тут она, взмахнув крылами,
Полетела над волнами
И на берег с высоты
Опустилася в кусты,
Встрепенулась, отряхнулась
И царевной обернулась...

*Аляксандр Пушкін.*
*Казка пра цара Салтана...*

Белый лебедь, лебедь чистый,
Сны твои всегда безмолвны,
Безмятежно-серебристый,
Ты скользишь, рождая волны.

*Канстанцін Бальмонт*





**Іван Білібін.**
Ілюстрацыі да
«Казкі пра цара Салтана...»

Да 100-гадовага юбілею паэта кампазітар Мікалай Рымскі-Корсакаў стварыў оперу «Казка пра цара Салтана». Музыка гучыць лёгка і нязмушана. Мы пазнаём мелодыі і рытмы народных песень і скокаў. Асабліва запамінальнымі з’явіліся выяўленчыя знаходкі ў аркестравых эпізодах оперы. У аркестравым уступе «Тры цуды» чутны святочныя фанфары, званы, маршавыя інтанацыі шырокай хады марскіх віцязяў.

Першая карціна IV дзеі оперы прысвечана вобразу Царэўны Лебедзі. Павольна, плаўна, спакойна разгортваецца мелодыя ў выкананні струнных музычных інструментаў. І вось ён, цуд! «Знай, близка судьба твоя, ведь царевна эта — я». Прыгожы вобраз Царэўны пастулова ўзнікае ва ўсёй сваёй веліччы.

Мастаком у першай пастаноўцы оперы быў Міхаіл Уру́бель — вядомы рускі жывапісец. Касцюмы, створаныя па яго эскізах, выклікалі ў публікі захапленне.

Партыю Царэўны Лебедзі выконвала жонка Урубеля — Надзея Забэ́ла-Урубель. Пад уражаннем загадкавага вобраза Царэўны,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне





**Міхаіл Урубель.**
Царэўна Лебедзь

Па́лехская шкатулка
«Царэўна Лебедзь»

увасобленага спявачкай, мастак піша карціну «Царэўна Лебедзь». Зграбная, вытанчаная, з лёгкай усмешкай, гераіня ў вобразе Царэўны Лебедзі ўражвае і захапляе адначасова! На карціне адлюстраваны момант пераўвасаблення грацыёзнай птушкі ў прыгожую царэўну. Паварочваючы твар да гледача, яна нібы запрашае нас стаць сведкамі гэтага цуду.

Казачныя сюжэты і героі спадарожнічаюць нам і ў штодзённым жыцці. Прыгледзьцеся: казачны вобраз можна сустрэць на посудзе, вопратцы, ручніках і іншых прадметах хатняга ўжытку.

Так і глядзіць на нас Царэўна Лебедзь каля двухсот гадоў дзякуючы майстэрству мастакоў. У розных кутках свету рознымі мастацкімі сродкамі «расказваецца казка». А мы дзякуючы мастацтву захоўваем у памяці казачныя вобразы, не забываючы пра людзей, якія іх стварылі.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Разгледзьце ілюстрацыі ў параграфе і электронным дадатку, на якіх увасоблены вобраз Царэўны Лебедзі. Майстры якіх відаў мастацтва з асаблівым жаданнем звяртаюцца да казачных вобразаў? Абгрунтуйце свой пункт гледжання, выкарыстоўваючы мастацкія прыклады.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Разгледзьце ілюстрацыі ў параграфе і электронным дадатку. Ахарактарызуйце вобраз Царэўны Лебедзі на кожным малюнку. Чаму гэты вобраз так любяць майстры розных відаў мастацтва? Абгрунтуйце сваю думку.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах аркестравы ўступ да II карціны IV дзеі оперы «Казка пра цара Салтана» Мікалая Рымскага-Корсакава. Першы цуд — вавёрка ў крыштальнай хатцы, якая грызе дзіўныя арэшкі з ізумруднымі ядзеркамі і залатымі шкарлупкамі. Другі цуд — трыццаць тры волаты на чале з дзядзькам Чарнаморам. Трэці цуд — з'яўленне Царэўны Лебедзі.

Знайдзіце кожны цуд у мультфільме «Казка пра цара Салтана» рэжысёраў Івана Іванова-Вано і Леаніда Мі́льчына, суаднясіце з творамі, змешчанымі ў параграфе і электронным дадатку.

Пафантазіруйце і прыдумайце чацвёрты цуд для вострава князя Гвідона. Падбярыце да яго музычны фон, падрыхтуйце ілюстрацыю. Прадэманструйце свой праект у класе.

## § 15. КАЗКА СТАРАЯ І НОВАЯ

Казкі, створаныя народам, перадаюцца з пакалення ў пакаленне. На іх аснове пісьменнікі, мастакі і кампазітары складаюць новыя сюжэты. У іх знаёмыя і любімыя героі становяцца ўдзельнікамі новых прыгод.

Шырока вядомая дзіўная гісторыя пра тое, як русалачка цаной свайго жыцця выратавала прынца. Гэта гісторыя так падабаецца майстрам мастацтва, што натхняе іх ствараць новыя казачныя творы.



**Эдвард Эрыксен.** Русалачка (Данія)

У вуснай народнай творчасці русалка — гэта міфічная істота, якая жыве ў водная стыхіі. Вобраз маладой прыгожай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

дзяўчыны з доўгімі валасамі і рыбіным хвастом сустракаецца ў легендах і паданнях розных народаў свету. У адных казках русалкі палохаюць людзей, у іншых — дапамагаюць ім, ратуюць ад смутку і нягод.

Адзін з самых цікавых сюжэтаў прапанаваў дацкі казачнік Ханс Крысція́н А́ндэрсен у казцы «Русалачка».

Чароўным дзіцём была гэта русалачка: такая ціхая, задуменная... Іншыя сёстры ўпрыгожвалі сябе рознымі аздобамі, якія дастаўляліся ім з разбітых караблёў, а яна любіла толькі свае чырвоныя, як сонейка, кветачкі ды прыгожага белага мармуровага хлопчыка, які ўпаў на дно мора з карабля, што затануў. Русалачка пасадзіла каля статуі ружовую вярбу, якая цудоўным чынам разраслася; галіны яе перавешваліся праз статую і хіліліся на блакітны пясок, дзе вагаўся іх фіялетавы цень: здавалася, вершаліны песцяць і цалуюць свае карані.

Русалачка — добрая, мілая і пяшчотная. Яе сэрца напоўнена любоўю да людзей, жаданнем дапамагаць ім. Яна таксама, як і чалавек, гуляе, радуецца, захапляецца, любіць слухаць казкі.



**Іван Білібін.**
Ілюстрацыя да казкі «Русалачка»

Старая бабуля распавядала ёй усё, што толькі ведала, пра караблі і гарады, пра людзей і жывёл. Асабліва займала і здзіўляла русалачку, што кветкі на зямлі мелі водар, — не тое што тут, у моры! — што лясы там былі зялёнага колеру, а рыбкі, якія жылі ў галінах, цудоўна спявалі. Бабуля называла рыбкамі птушачак, інакш унучкі не зразумелі б яе: яны ж ніколі не бачылі птушак...



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

І калі ў легендах і міфах русалка — адмоўная гераіня, якая губіць людзей, то ў казцы Ханса Крысціяна Андэрсена русалачка пакахала прынца і пакутуе ад неўзаемнага пачуцця. Яна робіць дабро для чалавека і гіне за яго.

Дзякуючы Хансу Крысціяну Андэрсену русалачка назаўжды засталася ў памяці людзей як вобраз светлы, паэтычны, ахвярны. Сіла мастацтваператварыла міфічную русалку ў яркую рамантычную істоту.

У сумнай гісторыі існуе прастор для фантазіі. Глядач атрымлівае магчымасць прыдумаць новую сюжэтную лінію. Гэты шлях бясконцы!

Казкі не бываюць старымі або новымі. Калі адну і тую ж гісторыю расказаць некалькі разоў, атрымаецца мноства новых гісторый. Так і ў мастацтве. Дзякуючы сродкам мастацкай выразнасці знаёмыя казачныя вобразы атрымліваюць новае ўвасабленне і новае аблічча.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Разгледзьце вобразы русалачкі, змешчаныя ў параграфе і электронным дадатку. Які з іх вам падабаецца больш за ўсё? Чаму?

2. У порце горада Капенгаген — сталіцы Даніі — можна ўбачыць скульптуру «Русалачка». Яе аўтар — Э́двард Э́рыксен. Апішыце знешнасць і ўнутраны стан гераіні. Чаму менавіта гэты твор мастацтва стаў сімвалам горада?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фільм «Русалачка» рэжысёра Уладзіміра Бычкова. Вандроўны паэт Сульпітыус у песні «Ах, хто сказаў, што жыццё цудоўнае…» з бацькоўскай любоўю расказвае русалачцы пра зямное жыццё. Хвалюючая мелодыя дапамагае напоўніць душу наіўнай дзяўчыны светлымі надзеямі. А з якімі яркімі бакамі сучаснага жыцця пазнаёмілі б русалачку вы? Прыдумайце і раскажыце ў класе свой фінал казкі пра русалачку.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 16. ТВОРЧЫ ЎРОК. У СВЕЦЕ ФАНТАЗІІ І ЎЯЎЛЕННЯ

Вядомы італьянскі пісьменнік Джа́ні Рада́ры ў сваіх кнігах навучаў складаць казкі. Ён лічыў, што казкі могуць прыдумляць усе людзі. Самае галоўнае — *уяўленне* і *фантазія*.

Пагуляем у гульню, якая называецца «Ствары новую казку».

***Першы спосаб*** складання новай казкі — перакручванне, скажэнне любой вядомай гісторыі. Напрыклад: *«Жыла-была Жоўты Каптурок»* ці *«Едзе Калабок на машыне, а насустрач яму…»*. Прыдумайце працяг самастойна ці разам з аднакласнікамі.

***Другі спосаб*** — гульня са словамі. Джані Радары прапануе пяць слоў, якія падказваюць сюжэт казкі пра Чырвоны Каптурок, а шостае слова выпадковае. Збярыце пяць слоў у адну гісторыю, а затым прыдумайце, якое дачыненне да яе мае шостае. У вас атрымаецца зусім новая казка.

***Трэці спосаб*** — казкі «навыварат». Пераблытайце герояў: *«Чырвоны Каптурок злосная, а воўк добры», «Папялушка давяла да роспачы рахманую мачыху»*… Чым больш вы «вывернеце» сюжэт казкі, тым больш смешнай будзе ваша гісторыя.

***Чацвёрты спосаб*** — «салата з казак». У адной гісторыі сустракаюцца героі і пераплятаюцца падзеі з розных казак. Што было б, калі б Чырвоны Каптурок сустрэла ў лесе Сыночка-з-кулачок з братамі, Пінокіа апынуўся ў доміку сямі гномаў, а Чыпаліна сустрэўся з Гары Потэрам?

Прыдумайце сваю казку! У якасці музычнага фону выкарыстоўвайце вядомую п’есу «Гумарэска № 7» чэшскага кампазітара Антані́на Дворжака. Лёгкая, далікатная мелодыя падкажа вам ідэі для новых прыгод.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 7

САПРАЎДНУЮ СЯМ'Ю ЗВЯЗВАЮЦЬ
НЕ СУВЯЗІ КРЫВІ, АЛЕ СТАСУНКІ
ПАВАГІ І РАДАСЦІ...
*Рычард Бах*

# СЯМ'Я Ў МАСТАЦТВЕ



**Фёдар Славянскі.** Сямейны партрэт на балконе

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 17. МАЯ СЯМ'Я

*«Мая сям'я...»* Пры гэтых словах кожны чалавек уяўляе нешта вельмі асабістае, вельмі важнае для яго. У дамашнім асяроддзі людзі адчуваюць сябе спакойна і ўпэўнена. Таму многія мастакі з асаблівым задавальненнем малявалі сябе сярод сямейнікаў, падкрэсліваючы любоў і павагу да блізкіх.



**Барыс Кустодзіеў.**
На тэрасе

На карціне «Сямейны партрэт на балконе» рускі мастак Фёдар Славя́нскі паказаў сваю сям'ю ў цёплы летні дзень. Дзеці гуляюць, бацька з маці нешта абмяркоўваюць, а строгая бабуля павучае ўнука.

У карціне шмат дэталяў. Яны распавядаюць нам пра зацікаўленні і захапленні ў сям'і. Гэты сямейны партрэт можна доўга разглядаць і нават «слухаць», уяўляючы гукі, якія напаўнялі гэты далёкі цёплы дзень.



**Уладзімір Макоўскі.** Дэспат сям'і. У майстэрні мастака



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Барыс Кустодзіеў намаляваў сваю сям'ю за вячэрняй гарбатай на тэрасе. Промні сонца на захадзе мякка асвятляюць усіх, хто сабраўся ля самавара. Але асабліва ярка яны вылучаюць малых — сына і дачку мастака. Так жывапісец паказвае нам самае каштоўнае, самае светлае ў сям'і — дзяцей.

Бываюць у жыцці сям'і і забаўныя моманты. Уладзімір Макоўскі адлюстраваў сям'ю мастака. На нейкі момант галоўным тут стала не творчасць, а клопаты дарослых пра дзіця, якое плача. Нават бацька-жывапісец адарваўся ад сваёй адказнай працы. Адчуваецца, што ён глядзіць на тое, што адбываецца, з усмешкай, і яго воклічы ўліваюцца ў агульны хор галасоў.

Добра, калі ўся сям'я разам. Разлука прыгнятае і засмучае сямейнікаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны вершы і песні пра каханне блізкіх падтрымлівалі і тых, хто ваяваў, і тых, хто чакаў абаронцаў з фронту. А калі воіны вярнуліся дадому з Перамогай, радасць сустрэчы з сям'ёй была бязмернай. Гэта пачуццё адлюстравалі многія савецкія мастакі.

У гады вайны большасць беларускіх гарадоў і вёсак была разбурана. Моцна пацярпеў і горад Мінск. Мастак Анатоль Тычы́на




**Анатоль Тычына.**
Гравю́ра
«У разбураным горадзе»



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сродкамі *графікі* адлюстраваў у творы «У разбураным горадзе» не толькі руіны, але і знойдзены надпіс, які пакінулі для родных тыя, каму ўдалося выратавацца.

**Гра́фіка** — від выяўленчага мастацтва, у якім выкарыстоўваюцца лініі, штрыхі і кропкі.

Як бачыце, пра сям'ю можна расказаць нават тады, калі ні адной чалавечай фігуры на малюнку няма.

У сям'і чалавек нараджаецца і сталее. Сям'я дапамагае і абараняе. Кожны чалавек марыць, каб яго сям'я была самай лепшай, самай шчаслівай.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Французскі пісьменнік Эмі́ль Заля́ пісаў: «Аснова сямейнага шчасця ў дабрыні, шчырасці, спагадлівасці». Знайдзіце сярод твораў, змешчаных у параграфе і электронным дадатку, прыклады такіх адносін. Падбярыце ў інфармацыйных крыніцах творы розных відаў мастацтва, у якіх адлюстраваны свет сям'і.

2. У кожнай сям'і здараюцца вясёлыя гісторыі. Папрасіце дарослых сямейнікаў падзяліцца адной з такіх гісторый. Раскажыце пра яе ў класе.



Скульптурная кампазіцыя «Мая сям'я» (Расія)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Не забудзьцеся крыху аздобіць вашу гісторыю: мастацкая выдумка — гэта важная частка мастацтва.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. У Маскве знаходзіцца скульптурная кампазіцыя «Мая сям'я», якую жыхары горада называюць «Далонькі». Чатыры далоні — вялікія, дарослыя ў цэнтры і маленькія, дзіцячыя па баках — сімвалізуюць сям'ю. У чым, на ваш погляд, праяўляецца арыгінальнасць мастацкіх вобразаў?

Пафантазіруйце і стварыце свой цікавы вобраз сям'і (тэхніка і матэрыял на выбар).

## § 18. ТРАДЫЦЫІ І ПАДЗЕІ Ў СЯМ'І

Жыццё кожнай сям'і поўнае розных падзей. Адны з іх важныя толькі для сям'і. Пра іншыя ведаюць сябры і сваякі, у залежнасці ад абставін віншуюць, суцяшаюць, прыходзяць на дапамогу.

Адной з найважнейшых падзей у жыцці сям'і становіцца нараджэнне дзіцяці. Блізкія людзі віншуюць бацькоў новападжанага, робяць падарункі. А вось першы крок малога — свята толькі для бацькоў. Малюнак «Першыя крокі» французскага мастака Жана-Франсуа Міле — адна з самых светлых работ майстра.



**Жан-Франсуа Міле.**
Першыя крокі



**Вінцэнт Ван Гог.**
Першыя крокі (паводле карціны Міле)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Старажытнарымскі рэльеф з эпізодамі жыцця Карнэлія Стацыя

Паглядзіце, якія выразныя жэсты ва ўсіх, каго мы бачым у гэтай простай і кранальнай сцэне.

Галандскі мастак Вінцэнт Ван Гог стварыў жывапіснае палатно па малюнку Жана-Франсуа Міле. У адным з лістоў ён пісаў, што не капіруе малюнкі Міле, а перакладае іх на іншую мову. І сапраўды, пад пэндзлем Ван Гога сюжэт не проста напоўніўся колерам, ён загучаў інакш: больш свежа, звонка, весела.

А колькі прыемных клопатаў і радасці прыносіць бацькам і блізкім сямейная традыцыя святкаваць дні нараджэння! Кожнае дзіця ў гэты дзень адчувае асаблівае трапятанне і хваляванне, знаходзіцца ў прадчуванні чагосьці цудоўнага і незвычайнага. Менавіта такімі эмоцыямі напоўнена п’еса «Дзень нараджэння» з фартэпіяннай сюіты «Дзіцячы сшытак» Дзмітрыя Шастаковіча.

Як бачыце, у мастацтве вялікае значэнне мае творчая індывідуальнасць аўтара — яго ўспрыманне свету і людзей, яго імкненне перадаць гледачу пэўны душэўны стан.

Старажытнарымскі рэльеф са сцэнамі жыцця хлопчыка, якога звалі Карнэ́лій Ста́цый, дазваляе нам прасачыць некалькі этапаў жыцця галоўнага героя. У першай сцэне маці корміць немаўля, а бацька задуменна назірае за гэтым. Хлопчык крыху падрос. У наступнай сцэне малое сядзіць на руках у бацькі і цягнецца ручкай да яго барады. У цэнтральнай частцы рэльефу мы бачым, як хлопчык запрог козліка ў цацачную калясніцу і кіруе гэтым складаным відам



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**П’ер Агюст Рэнуар.**
Дзяўчаты за фартэпіяна



**Фёдар Рашэтнікаў.**
Прыбыў на канікулы

«транспарту». У апошняй сцэне Карнэлій, які ўжо падрос, адказвае бацьку вывучаны ўрок. Такія моманты надоўга застаюцца ў памяці родных.

Увагу жывапісцаў прыцягвалі самыя розныя падзеі сямейнага жыцця. На карціне французскага мастака П’е́ра Агю́ста Рэнуа́ра дзве дзяўчыны развучваюць новую п’есу для фартэпіяна: паглядзіце, як зацікаўлена яны абмяркоўваюць музычны твор. На карціне савецкага мастака Фёдара Рашэ́тнікава хлопчык-суворавец дакладвае дзядулю: *«Прыбыў на канікулы!»*

Бываюць у сем’ях і цяжкія дні... Так, у сям’і мінскага двараніна Э́дварда Вайніловіча здарылася страшная трагедыя: заўчасна пайшлі з жыцця сын і дачка. Няўцешныя бацькі вырашылі ў памяць пра іх узвесці архітэктурнае збудаванне. Касцёл святых Сымона і Алены — так звалі дзяцей Эдварда Вайніловіча — знаходзіцца ў самым цэнтры горада Мінска. За яркі колер яго часта называюць Чырвоным касцёлам.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Эдвард Вайніловіч.**
Касцёл святых Сымона
і Алены
(г. Мінск, Беларусь)

У кожнай сям'і адбываюцца розныя падзеі — радасныя і сумныя. Любая з іх можа стаць тэмай мастацкага твора.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Да якіх відаў мастацтва адносяцца творы, змешчаныя ў параграфе і электронным дадатку? Якое ўражанне на вас зрабілі сямейныя гісторыі, расказаныя сродкамі мастацтва? Чаму майстрам мастацтва так важна паказаць свет сям'і?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

2. Адной з найважнейшых сямейных традыцый з'яўляюцца сумесныя гульні. Прапануйце сваёй сям'і «пагуляць у мастацтва». Напрыклад, у гульню «Сямейны фотаздымак з карціны». Для гэтага:

- пазнаёмце родных з карцінай «Сям'я» грузінскага мастака Ладо Тэўдара́дзэ;
- абмяркуйце на сямейнай радзе атмасферу, якая адлюстравана ў гэтай рабоце;
- зрабіце сямейны фотаздымак. Пастарайцеся размясціць усіх вашых блізкіх у хатнім інтэр'еры так, як гэта зрабілі героі карціны, ці на



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Ладо Тэўдарадзэ.**
Сям'я

прыродзе, у падарожжы і інш. Пастарайцеся ў фотаздымку адлюстраваць атмасферу вашай сям'і;

- арганізуйце ў класе галерэю сямейных фотаздымкаў і правядзіце конкурс на самае арыгінальнае ўвасабленне тэмы «Мая сям'я».

## § 19. ДАРОСЛЫЯ І ДЗЕЦІ

*«Мамы, таты, нам без вас — усё роўна, што вам без нас!»* — гэта словы з аповесці-казкі «Свята непаслушэнства» Сяргея Міхалкова. Дарослыя так засмуціліся з-за непаслушэнства сваіх дзяцей, што вырашылі сысці з горада. Спачатку дзеці без бацькоў весяліліся і дурэлі. Але потым зразумелі, што без дапамогі дарослых немагчыма вырашыць нават самыя маленькія праблемы. Дзецям зрабілася сумна і нават страшна...



**Надзея Крандзіеўская.**
Бацька і сын



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Мастакі, перш чым прыступіць да працы, уважліва назіраюць за ўзаемаадносінамі дарослых і дзяцей, разважаюць над убачаным. Затым увасабляюць свае ўражанні ў творах мастацтва. Часцей за ўсё ў гэтых творах гучыць матыў клопату пра дзяцей і абароны іх ад усялякіх бед і напасцяў.

Такое імкненне вельмі выразна адлюстроўвае жэст. Паглядзіце на скульптурны партрэт «Бацька і сын» Надзеі Крандзіеўскай. Жэсты, павароты галоў перадаюць, з аднаго боку, даверлівасць і ласку хлопчыка, з другога — сілу і пяшчоту мужчыны ў адказ.



**Лявонас Жукліс.**
Сям’я (Літва)



**Рэмбрант.**
Партрэт Цітуса, які чытае кнігу

Літоўскі скульптар Лявонас Жу́кліс стварыў скульптурную групу «Сям’я», якая знаходзіцца ў Вільнюсе. Паглядзіце, якія плаўныя лініі ўтвараюць контур кампазіцыі. Малое нібы спачывае ў мяккім кокане, што ўтвораны фігурамі бацькоў. Цёплы колер каменю на фоне снегу ўспрымаецца як нешта саграvalьнае, як увасабленне трываласці і надзейнасці.

Бацькі з задавальненнем назіраюць за тым, як растуць і сталеюць іх дзеці, і захоўваюць гэта з дапамогай фота- і відэаздымкі. А мастакі, асабліва тыя, якія жылі і працавалі ў ранейшыя часы, малявалі партрэты сваіх дзяцей.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Барыс Кустодзіеў.**
Бэз



**Барыс Кустодзіеў.**
Партрэт Ірыны Кустодзіевай з сабакам Шумкам

Галандскі жывапісец Рэмбрант вельмі любіў свайго адзінага сына Ці́туса. У той час далёка не ўсе дзеці навучаліся грамаце, а Цітус праявіў схільнасць да навукі. Таму бацька нярэдка маляваў хлопчыка са сшыткамі і кніжкамі і вельмі ганарыўся сваім адукаваным сынам.

Барыс Кустодзіеў стварыў шмат партрэтаў сваёй дачкі Ірыны. Вось яна, зусім маленькая, на руках у мамы. Вясна, квітнее бэз. І, здаецца, водар кветак ахутвае постаць маці з дзіцём, нібы духмянае воблака. А вось Ірына ўжо ўпэўнена стаіць на дужых ножках, сціскаючы ў руцэ букет кветак. Гэта карціна яркая і святочная, як дзіцячая цацка.

Сям'я — адна з галоўных каштоўнасцей у жыцці людзей. Майстры мастацтва дапамагаюць нам гэта зразумець, адчуць, даюць магчымасць палюбавацца шчаслівымі сем'ямі і паспачуваць тым, у каго нешта не ладзіцца. Кожны з нас можа стаць мастаком і адлюстраваць свет сваёй сям'і.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Уважліва ўгледзьцеся ў выразы твараў дзяцей і бацькоў у творах, змешчаных у параграфе і электронным дадатку. Якія эмоцыі вы бачыце?

2. Кампазітар Уладзімір Шаі́нскі і паэт Міхаіл Та́ніч напісалі нямала песень для дзяцей. Паслухайце іх «Песню пра тату» ў інфармацыйных крыніцах. Як бы вы ахарактарызавалі настрой, які перадаюць аўтары і выканаўцы? Апішыце ці сфатаграфуйце сітуацыю, якая ілюструе сэнс песні. Праспявайце яе хорам.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. З сям'ёй можна сустрэцца ў прыродным асяроддзі і ў асяроддзі самых звычайных прадметаў. Напрыклад, сям'я баговак. Або сям'я алоўкаў — аловак-тата, аловак-мама, аловак-дзіця, а яшчэ аловак-бабуля і аловак-дзядуля.

Паглядзіце навокал! Паспрабуйце знайсці ўласныя прыклады сем'яў. Прыдумайце пра адну з іх аповед «Выдатная сямейка»: пра вясёлыя клопаты, здарэнні, прыгоды. Намалюйце вашых рэальных ці фантастычных герояў. Ці могуць яны стаць персанажамі мультыплікацыйнага фільма?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 8

САМЫЕ СИЛЬНЕЙШИЕ И ВЛИЯЮЩИЕ ВОСПОМИНАНИЯ ПОЧТИ ВСЕГДА ТЕ, КОТОРЫЕ ОСТАЮТСЯ ИЗ ДЕТСТВА.

*Фёдар Дастае́ўскі*

# СВЕТ ДЗЯЦІНСТВА Ў МАСТАЦТВЕ



**Май Да́нцыг.** Сонечны кантынент

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 20. ДЗІЎНЫ СВЕТ ДЗЯЦІНСТВА



**Зінаіда Серабракова.**
Каця з нацюрмортам



**Мікалай Ге.**
Партрэт Вольгі Паўлаўны Кастычовай

Майстры мастацтва заўсёды любілі маляваць дзяцей. Напэўна, таму, што глядзець на выявы дзяцей, чытаць і слухаць займальныя гісторыі пра іх падабаецца ўсім. Дарослым — таму, што ўсе дарослыя былі калісьці дзецьмі. А дзецям — таму, што гэта пра іх...

Дзеці, як і ўсе людзі наогул, бываюць розныя: вясёлыя і сумныя, таварыскія і недаверлівыя, бесклапотныя і сур'ёзныя. Усю гэту разнастайнасць пачуццяў, настрояў спрабуюць перадаць мастакі ў сваіх творах.

Напрыклад, мастачка Зінаіда Серабракова любуецца лёгкім і бестурботным характарам сваёй дачкі Каці. Такой жа рухавай паўстае юная гераіня балета Сяргея Пракоф'ева «Рамэ́а і Джулье́та» ў сцэне «Джульета-дзяўчынка».

А вось зусім іншы вобраз. Вользе Кастычовай усяго адзінаццаць гадоў. Яна расце ў сям'і навукоўца, шмат чытае і разважае. Аўтар партрэта, мастак Мікалай Ге, звяртае нашу ўвагу на сур'ёзнасць і задуменнасць дзяўчынкі. У назве карціны нават пазначана яе імя па бацьку.

Партрэты дзяцей часта пісаў і беларускі жывапісец Іван Хруцкі. На «Партрэце дзяўчынкі ў блакітнай сукенцы» гераіня апранута так, як прынята было апранаць дзяцей з дваранскіх сем'яў у XIX стагоддзі. На ёй кароткая шаўковая сукенка



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з фальбонамі, з-пад якой бачны доўгія карункавыя штонікі, на нагах — мяккія скураныя боцікі. Побач вялікі капялюш з блакітнымі стужкамі з такога ж шоўку, як і сукенка. Можна ўявіць, як будзе выглядаць юная модніца, калі капялюш апынецца ў яе на галаве. Твар дзяўчынкі выказвае гонар: *«Я пазірую мастаку»*.



**Іван Хруцкі.**
Партрэт дзяўчынкі ў блакітнай сукенцы

Выява маленькага сабачкі робіць карціну па-хатняму ўтульнай. На лаўцы — кошык з пышнымі кветкамі. Іван Хруцкі любіў дапаўняць выявы людзей шыкоўнымі букетамі. Прыгажосць кветак падкрэслівае дасканаласць знешнасці мадэлі.

Далей разгледзім партрэты хлопчыкаў. На палатне Валянціна Сярова — парывісты і ўражлівы Міка Марозаў. Малога цяжка прымусіць сядзець спакойна і пазіраваць мастаку. Ён на ўсё рэагуе вельмі эмацыянальна. Але дарослыя не перашкаджаюць яго



**Валянцін Сяроў.**
Партрэт Мікі Марозава



**Іван Хруцкі.**
Хлопчык у саламяным капелюшы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Васіль Трапінін.**
Партрэт сына Арсенія

бурным рэакцыям, асабліва калі гэта водгук на творы мастацтва. Хлопчык вырасце і ў далейшым стане аўтарытэтным мастацтвазнаўцам. А эмацыянальнасць застанецца.

Безыменны хлопчык у саламяным капелюшы, намаляваны Іванам Хруцкім, відаць, сваю ролю мадэлі выконвае паслухмяна. І ўсё ж стаяць спакойна з кошыкам вінаграду сумна і цяжка. Дзіця стамілася, а мастак дакладна перадаў яго стомлены погляд. Усе дэталі яго касцюма прыгожыя: пышная, прысабраная па рукавах і каўняры кашуля, на капелюшы — паўлінавае пяро.

Спакойным і задуменным адлюстраваў свайго сына Арсенія выдатны рускі мастак Васіль Трапі́нін. Бачна, што жывапісец ганарыцца сваім сынам — перад намі свабодная, ясная і вольная душа.

Таленавітыя мастакі як чараўнікі. Яны не толькі перадаюць унутраны стан і характар мадэлі, але і нярэдка прадчуваюць ці проста сілай уяўлення ствараюць іх будучыню.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Уважліва разгледзьце ўсе партрэты, змешчаныя ў параграфе і электронным дадатку. Якое ўражанне яны зрабілі на вас? Якія выразныя сродкі выкарыстоўваюць майстры мастацтва для таго, каб перадаць характар і настрой сваіх герояў?

2. Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах сцэну «Джульета-дзяўчынка» з балета «Рамэа і Джульета» Сяргея Пракоф'ева (І дзея, ІІ карціна). Якія эмоцыі юная Джульета перадае ў танцы? Ахарактарызуйце асноўныя паставы і рухі гераіні. Якія сродкі музычнай выразнасці выкарыстоўвае кампазітар для адлюстравання характару Джульеты (дынамічныя адценні, музычныя інструменты, змяненні тэмпу, рытмічны малюнак)?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прадэманструйце танцавальныя рухі галоўнай гераіні, якія ярчэй за ўсё перадаюць характар музычнага вобраза, яго рухомасць, імклівасць і жвавасць.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Свой аўтапартрэт нямецкі мастак А́льбрэхт Дзю́рэр напісаў у 13 гадоў. У верхнім куце ён пакінуў надпіс: «Гэта я сам намаляваў у люстэрку ў 1484 годзе, калі быў яшчэ дзіцём. Альбрэхт Дзюрэр». Якім уяўляецца вам Дзюрэр-хлопчык? Што вас здзівіла ў гэтым партрэце?

Паспрабуйце і вы стварыць аўтапартрэт. Падрыхтуйце фотасесію «Аўтапартрэт. Мой настрой» (5–6 фотаздымкаў). Што вы хацелі расказаць пра сябе сябрам?



**Альбрэхт Дзюрэр.**
Аўтапартрэт

## § 21. ЗАНЯТКІ І ЗАХАПЛЕННІ ДЗЯЦЕЙ

Дзецям сумна сядзець без справы. З самага маленства іх займаюць гульні і цацкі. Мастакі ўважліва назіраюць за дзецьмі, іх захапленнямі і заняткамі і распавядаюць пра гэта ў сваіх творах.

Напрыклад, адна з любімых тэм у многіх мастакоў — дзяўчынка з лялькай. Паглядзіце, як клапатліва гераіня палатна Васіля Трапініна трымае сваю любіміцу, якую сімпатыю ў яе выклікае цацачная сяброўка.

Вытанчаную фартэпіянную п’есу пад назвай «Серанада ляльцы» напісаў французскі кампазітар Клод Дэбюсі́. Ён прысвяціў яе любімай цацца сваёй дачкі Шушу. У далікатнай музычнай тэме адгадваюцца нязграбныя, крыху механічныя рухі лялькі. Разам з тым музыка поўная грацыёзнай жаноцкасці і какецтва, быццам кампазітар



**Васіль Трапінін.**
Дзяўчынка з лялькай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Аляксей Венецыянаў.**
Пастушок спіць

увасабляе ў вобразе лялькі рысы сваёй мілай дачкі.

Далёка не заўсёды дзецям удавалася гуляць і весяліцца. Юны пастушок на карціне Аляксея Венецыя́нава прачнуўся задоўга да світання. Блізка паўдня ён зусім стаміўся. Хлопчык прыхінуўся да дрэва і, мусіць, сам не заўважыў, як заснуў.

Знакамітая карціна Васіля Пярова «Тройка», створаная ў XIX стагоддзі, узрушыла сучаснікаў мастака. Цяжкае бязрадаснае жыццё бедных дзяцей, намаляваных на палатне, прымусіла дарослых адчуць віну перад тымі, хто пазбаўлены дзяцінства.

Зімовае змяркание. Завіруха. Два хлопчыкі і дзяўчынка запрэгліся ў сані і з цяжкасцю цягнуць па гарадской вуліцы велізарную абледзянелую бочку з вадой. Дзеці выбіліся з сіл. Рэзкі вецер прадзімае наскрозь іх падраную вопратку. Нейкі добры чалавек дапамагае ім уцягнуць сані на пагорак.

Пяроў назваў карціну «Тройка». Колькі болю і горычы ў гэтай назве! Мы прывыклі да песень пра заліхвацкую тройку, пра шпаркую тройку, а тут — тройка змучаных дзяцей. Да назвы карціны — «Тройка» — Пяроў прыпісаў: «Вучні майстравыя вязуць ваду»...

*Уладзімір Парудамі́нскі.*
*«Пяроў. Тройка»*



**Васіль Пяроў.**
Тройка



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Мікалай Багданаў-Бельскі.**
За кніжкай

Многія дзеці любяць чытаць, але яшчэ больш — слухаць. Паглядзіце, з якой цікавасцю слухаюць дзяўчынкі сваю сяброўку, якая чытае кніжку ўслых. Як адухоўлены твары дзяцей на карціне «За кніжкай» Мікалая Багда́нава-Бе́льскага! У якіх галактыках, у якіх краінах яны цяпер апынуліся?

Сапраўдны Мастак у душы застаецца дзіцём. Мабыць, таму яркі і разнастайны свет дзіцячых захапленняў ажывае ў творах мастацтва. У іх вы можаце знайсці ўсё, што прыносіць дзецям радасць: адпачынак з сябрамі, заняткі спортам, вандроўкі…



**Іларыён Пра́нішнікаў.**
Дзеці на рыбалцы



**Уладзімір Яроменка.**
Алёшка



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Успамінаючы свае дзіцячыя заняткі і захапленні, назіраючы за гульнямі дзяцей, мастакі падказваюць нам, як важна ўважліва ўзірацца ў тое, што з'яўляецца для нас звычайным і штодзённым.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Падбярыце словы-эпітэты да вобразаў усіх герояў мастацкіх твораў з параграфа і электроннага дадатку. Адлюструйце ў гэтых словах сваё стаўленне да персанажаў.

2. Паслухайце ў электронным дадатку п'есу «Маленькі пастух» з сюіты для фартэпіяна «Дзіцячы куток» Клода Дэбюсі. Ці адлюстроўвае музыка сюжэт карціны «Пастушок спіць» Аляксея Венецыянава? Ахарактарызуйце вобразы пастушка (3–5 эпітэтаў) у гэтых творах. Што ў сюжэце карціны сугучна танцавальным інтанацыям музыкі? Напейце інтанацыі, якія нагадваюць найгрышы пастушка на жалейцы або флейце.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Уявіце, што вы займаецеся ў студыі мультфільмаў. Прыдумайце сюжэт казкі паводле плана:

- Бацькі даюць даручэнне дзіцяці.
- Герой адпраўляецца выконваць яго.
- У дарозе з малым адбываецца прыгода.
- Герой спраўляецца з сітуацыяй і выконвае заданне.
- Сям'я з радасцю сустракае падарожніка.

Падбярыце да гісторыі адпаведны музычны фон. Раскажыце яе ў класе.

## § 22. ДЗЕЦІ І МАСТАЦТВА

Дзеці любяць маляваць, спяваць, многім падабаецца танцаваць, а хтосьці спрабуе пісаць вершы. Некаторыя бяруцца за асваенне мастацтва ўсур'ёз: адпраўляюцца ў мастацкія, музычныя школы, студыі і пачынаюць вывучаць законы творчасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Луі Кармантэль.**
Леапольд Моцарт з сынам Вольфгангам і дачкой Нанэ́рль

Сям'я Вольфганга Амадэя Моцарта праславілася на ўсю Еўропу дзякуючы музычнаму дару маленькага хлопчыка. Ён стаў першым дзіцём, якое адправілася на сапраўдныя гастролі. На малюнку французскага мастака Луі́ Карманто́ля маленькі Моцарт адлюстраваны з бацькам і старэйшай сястрой. Малы ўпэўнена адчувае сябе за клавесінам і апрануты па-даросламу.



**Іван Фірсаў.**
Юны мастак



**Франц Хальс.**
Хлопчыкі спяваюць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Павел Фядотаў.**
Партрэт Н. П. Ждановіч
за фартэпіяна

На карціне «Юны мастак» рускага жывапісца Івана Фі́рсава намалявана майстэрня. На сценах — карціны прафесійных мастакоў. На стале — жаночы бюст і мадэль чалавечай фігуры на шарнірах (такія мадэлі дапамагалі вучням ствараць кампазіцыі з разнастайнымі пастаевамі герояў). Хлопчык-падлетак, які ўжо засвоіў многія навыкі свайго рамяства, працуе над партрэтам дзяўчынкі. Маленькая мадэль стамілася, і мама (ці няня) дапамагае ёй захоўваць патрэбную паставу. Юны мастак пакуль незадаволены сваёй работай: ён здолеў намаляваць знешнасць дзяўчынкі, але яшчэ не змог перадаць яе ўнутраны стан.

Малюнкі, на якіх дзяцей вучаць музыцы, з'явіліся вельмі даўно. На карціне «Хлопчыкі спяваюць» галандскі мастак Франц Хальс паказаў дзяцей, якія выконваюць музыку па нотах. Рускі жывапісец Павел Фядотаў адлюстраваў за клавішамі дванаццацігадовую Надзею Ждановіч. На дзяўчынцы форменны ўбор вучаніцы Інстытута шляхетных дзяўчат. У гэтай навучальнай установе дзяўчынак абавязкова вучылі не толькі навукам, але і мастацтвам.



**Мікалай Багданаў-Бельскі.**
Талент

Здольнасць адгукацца на прыгажосць — таксама свайго роду талент. Паглядзіце, як усхвалявала дзеда таленавітая ігра хлопчыка на карціне «Талент» Мікалая Багданава-Бельскага.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У біблейскай прытчы гаворыцца: *«Не закопвай талент у зямлю»*. Гэта азначае, што кожнаму з нас неабходна ўважліва ставіцца да сваіх здольнасцей, працаваць над імі, развіваць іх на радасць людзям.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Разгледзьце карціны ў параграфе і электронным дадатку. Як вы думаеце, што адчуваюць бацькі, гледзячы на сваіх таленавітых дзяцей? Для адказу выберыце адну карціну.

2. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны, якая адкрывае раздзел. На ёй беларускі мастак Май Да́нцыг адлюстраваў знакамітую студыю Сяргея Каткова, адкуль выйшла мноства прафесійных мастакоў. Якія тэмы для сваіх работ выбралі дзеці? А што намалявалі б вы, каб зацікавіць дарослага майстра?



**Надзя Рушава.**
Кентаўраня

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Юная мастачка Надзя Ру́шава ўразіла свет сваёй творчай фантазіяй. Дзяўчынка здолела стварыць новыя ўнікальныя мастацкія вобразы. Адным з самых яркіх малюнкаў Надзі з'яўляецца кентаўраня — істота з галавой чалавека і целам каня. Што асаблівага вы бачыце ў гэтай выяве? Што можаце распавесці пра кентаўраня?

Прыдумайце цікавую гісторыю з героем Надзі Рушавай і раскажыце яе аднакласнікам.

## § 23. ДЗЕЦІ МАРАЦЬ ПРА БУДУЧЫНЮ

Кожны чалавек пра нешта марыць. Юныя летуценнікі ў сваіх жаданнях узнімаюцца да нябёсаў, заваёўваюць фантастычныя прасторы, становяцца знакамітасцямі. Пасталеўшы, многія людзі здзяйсняюць свае мары і дапамагаюць тое ж самае зрабіць дзецям, развіваючы іх здольнасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Васіль Максімаў.**
Будучы мастак

Рускі жывапісец Васіль Макс́імаў, калі быў яшчэ хлопчыкам, пачаў вучыцца ў іканапіснай майстэрні. Калі ён, дарослы паспяховы мастак, наведаў родныя мясціны, на яго нахлынулі ўспаміны пра дзяцінства. Іх вынікам сталі карціны «Будучы мастак» і «Зноў на радзіме».

Карціна «Вуснае лічэнне» Мікалая Багданава-Бельскага — свайго роду падзяка мастака чалавеку, які дапамог яму стаць прафесійным жывапісцам. Сяргей Рачы́нскі быў памешчыкам у тых мясцінах, дзе з'явіўся на свет хлопчык. Дзіця так і запісалі — Багданаў, гэта значыць «Богам дадзены». Рачынскі адкрыў бясплатную школу для сялянскіх дзяцей, дзе і выкладаў. Педагог заўважыў талент аднаго са сваіх вучняў і дапамог яму атрымаць прафесійную мастацкую адукацыю. Другую



**Васіль Максімаў.**
Зноў на радзіме



**Мікалай Багданаў-Бельскі.**
Вуснае лічэнне



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

частку свайго прозвішча жывапісец атрымаў «з рук» цара. Той, падпісваючы дыплом акадэміка жывапісу, дадаў да прозвішча «Багданаў» назву яго роднага павета — «Бельскі».



**Фёдар Рашэтнікаў.**
Хлопчыкі

Мікалай Багданаў-Бельскі — гэта яркі прыклад ажыццяўлення дзіцячай мары ў дарослым жыцці.

Дзеці XXI стагоддзя мараць пра будучыню, звязаную з самымі рознымі сферамі жыцця — навукай, тэхнікай, мастацтвам, як і героі палотнаў знакамітых мастакоў. Знаёмячыся з «Хлапчуком» Барыса Ня́менскага, гледачы вяртаюцца ў свет уласных дзіцячых мрояў пра будучыя важныя адкрыцці і дасягненні. Разглядаючы дзявочы тварык у люстэрку на карціне Нормана Роквела, мы разумеем, што шчасце



**Барыс Няменскі.**
Хлапчук



**Норман Роквел.**
Люстэрка



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

заключаецца не ў вядомасці, як у актрысы на фотаздымку, а ў радасці, якую дораць артысты людзям. Хлопчыкі з палатна Фёдара Рашэтнікава, вядома ж, у будучыні прадоўжаць справу першых касманаўтаў у засваенні прастораў Сусвету.

Разнастайныя мары дзяцей адлюстраваны ў песнях кампазітара Яўгена Крыла́тава на вершы паэта Юрыя Э́нціна. Напрыклад, у песні «Мы маленькія дзеці» з кінафільма «Прыгоды Электроніка» герой фантазіруе пра цікавае жыццё без школы. У песні «Прыгожае далёка» з кінафільма «Госця з будучыні» дзеці мараць пра тое, каб пабываць у будучыні, убачыць, як зменіцца жыццё людзей на планеце Зямля.

У мастацкіх вобразах увасабляецца тое, пра што мы думаем або марым. Пільна ўзіраючыся ў люстэрка мастацтва, мы становімся разумнейшымі, дабрэйшымі, лепшымі.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія эмацыянальны водгук у вас выклікаюць гісторыі герояў твораў, прапанаваных у параграфе і электронным дадатку? Пра што, па-вашаму, мараць дзеці? Якія сродкі выразнасці дапамагалі вам зразумець гэта? Як мастакі ставяцца да сваіх мадэляў?

2. Пра што разважаеце і марыце вы, назіраючы за героямі? Запішыце ў сшытку «воблака слоў», якія дапамогуць вам апісаць сваю мару.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах і праспявайце куплет адной з песень Яўгена Крылатава. Абмяркуйце з аднакласнікамі, якія мары пра будучыню блізкія вам.

Пафантазіруйце, як зменіцца жыццё школьнікаў у XXII стагоддзі. Падрыхтуйце эскіз «Прадмет са школы будучыні» (падручнік, парта, школьная дошка і г. д.). Як гэты прадмет будзе выглядаць, як можа ўдасканальвацца? Ці, можа, яго заменіць нейкі іншы прадмет?

Ці было вам цікава марыць пра школу будучыні? Ці захацелася ўбачыць, якія з вашых ідэй увасобіліся на практыцы ў школе XXII стагоддзя?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 9

СЭРЦА МАЦІ — ГЭТА БЕЗДАНЬ, У ГЛЫБІНІ ЯКОЙ ЗАЎСЁДЫ ЗНОЙДЗЕЦЦА МЕСЦА ДАРАВАННЮ.

*Анарэ́ дэ Бальза́к*

# ВОБРАЗ МАЦІ Ў МАСТАЦТВЕ



**Рафаэль.** Сіксцінская Мадонна

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 24. ВЕЛІЧ МАТЧЫНАГА СЭРЦА

Мама ў жыцці кожнага чалавека — самы блізкі і дарагі чалавек. Ласкавая ці строгая, сумная ці вясёлая, рашучая ці нясмелая — яна заўсёды побач з намі. Мама ўвасабляе дабро, ласку, клопат. Матчына сэрца не ведае меж. Яно чыстае, чулае, міласэрнае, мяккае. У ім заўсёды знойдзецца месца цярпенню, суперажыванню, высакароднасці, дараванню.

Ва ўсе часы вобраз маці захапляў творцаў і натхняў іх на стварэнне вялікіх твораў мастацтва. У большасці мастацкіх твораў мама — сардэчны, шчыры, спагадлівы сябар, настаўнік і абаронца.

Клопат маці пра сваё малое — у цэнтры скульптурнай кампазіцыі Фёдара Каме́нскага. Мастак адлюстраваў хвалюючы момант у жыцці кожнай маці — першыя спробы яе дзіцяці самастойна хадзіць. Скульптар паказаў маці засяроджанай, адухоўленай і шчаслівай. Ледзь улоўная ўсмешка паказвае найвялікшую радасць. Яе разведзеныя ў бакі рукі аберагаюць малое ад магчымых удараў. Балансуючы з боку на бок, дзіця робіць свае першыя няўмелыя крокі.



**Фёдар Каменскі.**
Першыя крокі

Адзін з эпізодаў жыцця сваёй сям'і паказаў у карціне «Раніца» Барыс Кустодзіеў. Ён намаляваў сваю жонку, якая купае іх першынца. Матчыны пачуцці выяўляюцца праз радасны стан немаўляці. Малое гуляе, і нам здаецца, што мы чуем удары яго далонек па вадзе. Прамяні ранішняга сонца заліваюць пакой цяплом і святлом, падкрэсліваюць жывую, радасную атмасферу.

Іншыя якасці матчынай душы раскрываюцца ў манументе ў гонар маці-патрыёткі Настассі Фамі́нічны Купрыя́навай. Аўтары паказваюць жанчыну



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Барыс Кустодзіеў.**
Раніца

мужную, якая валодае велізарнай сілай духу. Перад намі — рэальная гісторыя. Маці адпраўляе пяцярых сыноў на вайну. Прыціснуўшы руку да грудзей, яна быццам развітваецца са сваімі дзецьмі, якія рашуча крочаць насустрач будучым баталіям. Яе накіраваны ўдалечыню позірк і пастава поўныя малення, веры і надзеі...

Патрыятычныя пачуцці выклікае вобраз маці на карціне «Партызанская мадонна» беларускага мастака Міхаіла Саві́цкага. У яе поглядзе душэўны боль і трывога. Суровыя фарбы вайны ствараюць кантраст з заспакоеным абліччам мадонны. Яна задуменная,



**Андрэй Заспі́цкі, Іван Міско, Мікалай Рыжанкоў.**
Манумент у гонар маці-патрыёткі Н. Ф. Купрыянавай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Міхаіл Савіцкі.**
Партызанская мадонна



**Кузьма Пятроў-Водкін.**
Маці

яе погляд поўны надзеі. Аднак за знешнім спакоем маці хаваецца ўнутранае напружанне.

Кузьма Пятроў-Водкін шмат разоў звяртаўся да тэмы мацярынства. Угледзьцеся ў адну з яго работ. Сялянка, седзячы на траве, корміць дзіця. У карціне ўвасоблены вобраз Маці ўсіх часоў. Пяшчота, клопат, трывога за будучыню дзіцяці напаўняюць яе позірк задуменнасцю. Яркія фарбы адзення жанчыны сімвалізуюць Жыццё. Угледзьцеся ў пейзаж, які служыць фонам. Шырокі паварот магутнай ракі абмывае зялёны ўзгорак — сімвал самой Зямлі. Эпохі прыходзяць і сыходзяць. А Маці і Дзіця — вечныя...

У розныя часы ў розных відах і жанрах мастацтва тэма мацярынства раскрывалася па-свойму. Але заўсёды ў вобразе маці адлюстроўваюцца найвышэйшыя душэўныя якасці чалавека — дабрыня, чуласць і пяшчота.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія матчыны якасці перададзены ў творах мастацтва, з якімі вы пазнаёміліся ў параграфе і электронным дадатку? Якая з работ вам спадабалася найбольш? Чаму?

2. Калыханка — гэта першая песня, якую чуе немаўля ў сваім жыцці. Яе напявае мама, каб дзіця супакоілася і заснула.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Таму мелодыя мае спакойны і ўлагоджаны характар. Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах калыханку Звездара (музыка Аляксея Ры́бнікава, словы Юлія Кі́ма) з музычнага фільма «Пра Чырвоны Каптурок». Вывучыце словы калыханкі. Выканайце яе ў класе разам з героямі фільма.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Выканайце фотапартрэт сваёй мамы (бабулі або самага блізкага чалавека). Ахарактарызуйце атрыманы вобраз. Якія рысы характару вы хацелі паказаць?

# § 25–26. СВЯШЧЭННЫ ВОБРАЗ МАЦІ

Са старажытных часоў мастакі імкнуліся ўвасобіць у вобразе маці боскі пачатак. Багіню-маці заўсёды прадстаўлялі як жанчыну, якая дае жыццё ўсяму жывому на Зямлі. Яе ўшаноўвалі, ёю захапляліся, яе ўзносілі...

***Паганскія вобразы Багіні-маці.*** Розныя народы заўсёды ўяўлялі Багіню-маці па-рознаму. Гэта было звязана з існуючымі вераваннямі і традыцыямі.

Першыя выявы маці з дзіцём з’явіліся ў першабытную эпоху — у наскальным жывапісе. Першабытны чалавек імкнуўся назаўсёды захаваць тое, што лічыў найбольш значным у сваім жыцці.



Маці з дзіцём. Фрагмент наскальнага роспісу ў цясніне Тасілі́н-Аджэ́р (Алжыр)



Народная вышыўка з сімвалічнай выявай багіні ўрадлівасці



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Фаянсавая статуэтка «Багіня Ісіда з немаўляткам Горам» (Старажытны Егіпет)



Тэракотавая статуэтка «Афрадыта з Эротам» (Старажытная Грэцыя)

У старажытных славянскіх культурах шанавалася Маці-Зямля — багіня ўрадлівасці і сямейнага дабрабыту, якая дорыць зямлі ўраджай і працяг роду: *«Маці-Зямля ўсіх корміць, усіх поіць, усіх апранае, усіх сваім цяплом саграваe»*.

У Старажытным Егіпце Багіню-маці Ісіду часцей малявалі ў вобразе жанчыны, якая сядзіць на троне. Захавалася мноства статуэтак Ісіды з немаўляткам Горам на руках. У іх майстры паказваюць Ісіду як маці-карміцельку. Постаці Ісіды і немаўляці Гора пазбаўлены руху, быццам застылі ў камені на стагоддзі.

У Старажытнай Грэцыі матчыны пачуцці мастакі нярэдка адлюстроўвалі ў вобразе Афрады́ты — багіні прыгажосці, кахання, урадлівасці.

У адной са статуэтак — «Афрадыта з Эротам» — скульптар паказаў цёплыя пачуцці маці да сына. Афрадыта пяшчотна прыціскае да сябе малога, яе погляд поўны любові і клопату. Майстар адлюстраваў адзін з важных момантаў у жыцці дзяцей — гульню. Багіня-маці забаўляе дзіця з дапамогай бразготкі. Немаўля захоплена сочыць за рухам цацкі, а маці не адрывае позірку ад малога.

***Выява Маці ў хрысціянскай культуры.*** У хрысціян вобраз Маці займае ганаровае месца. Ён сімвалізуе веру і чысціню душы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Найвышэйшае пачуццё матчынай любові перадаюць *абразы* Божай Маці з немаўлём «Замілаванне». На такіх абразах Багародзіца малюецца з немаўлём Хрыстом на руках. Яна пяшчотна прытулілася да яго. Цёплыя абдымкі маці і дзіцяці, мяккасць матчыных рук, задуменны погляд Марыі, напоўнены смуткам пра трагічны лёс свайго сына, адлюстроўваюць пачуццё бязмежнай любові.

Смутак і душэўны боль Багародзіцы, якая аплаквае свайго сына Хрыста, перададзены ў скульптурнай кампазіцыі «П’ета́», створанай вялікім італьянскім майстрам Мікела́нджэла. Далікатная постаць маладой прыгожай жанчыны, у вобразе якой мастак адлюстраваў Дзеву Марыю, трымае на каленях нежывое цела сына. Яе позірк, звернуты да Хрыста, сведчыць пра бязмернае матчына гора. Адной рукой яна пяшчотна прыціскае да сябе свайго сына, а другая адведзена ўбок, быццам паказвае на непазбежнасць таго, што адбылося.

Маці, якая аплаквае свайго сына, — асноўная тэма і ў кантаце «Stabat Mater» Джава́ні Баці́сты Пергале́зі. Дзіўна шчырая і простая мелодыя напоўнена



Уладзімірскі абраз Божай Маці



Божая Маці Замілаванне (г. Маларыта, Беларусь)

**Абра́з —** сяшчэнная выява рэлігійных сюжэтаў і вобразаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Мікеланджэла.**
П’ета

тужлівымі і адначасова светлымі, узвышанымі інтанацыямі. Пакора і святло адчуваюцца ў кожнай музычнай фразе.

Трывожныя пачуцці маці, якая перажывае за лёс свайго сына, адлюстраваў у карціне «Сікстíнская Мадонна» іншы знакаміты італьянскі мастак — Рафаэль. Мадонна з немаўлём, мякка ступаючы па аблоках, спускаецца з нябёсаў на зямлю. Яе позірк накіраваны ўдалячынь і засмучаны будучыняй Хрыста. Сум мы бачым і ў вачах немаўляці. Але карціна, нягледзячы на гэта, успрымаецца ўрачыста. Сама Мадонна з немаўлём на руках нібы выпраменьвае перамогу дабра над злом. Твары, што губляюцца ў смузе аблокаў і складаюць фон карціны, — гэта анёлы, якія з надзеяй назіраюць за гэтай узнёслай сцэнай.

Вобраз маці ў мастацтве з’яўляецца адным з цэнтральных. Яму прысвечана мноства мастацкіх твораў рознага характару — лірычных, трагічных і гераічных. Але ва ўсіх творах мастацтва вобраз маці адухоўлены і паэтычны.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Як вы думаеце, чаму людзі з даўніх часоў пакланяюцца Багіні-маці? Чаму вобраз маці з’яўляецца адным з самых старажытных, а мацярынства ў мастацтве адлюстравана найбольш ярка і глыбока?

2. Чаму ў мастацтве вобраз Божай Маці часцей за ўсё выяўляецца сумным? Абгрунтуйце свой пункт гледжання, выкарыстоўваючы музычныя прыклады, прапанаваныя ў параграфе і электронным дадатку.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Для ўвасаблення глыбіні пачуццяў майстры мастацтва часта выкарыстоўваюць нечаканыя прыёмы. Напрыклад, Рафаэль у рабоце



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

«Мадонна ў крэсле» хацеў стварыць адчуванне ўтульнасці, прымірэння і гармоніі і замест прамавугольнага фармату выкарыстаў круглы. Карціна ўражвае мяккімі лініямі, працягласцю і «пявучасцю» контураў выяў.

- Каляровымі алоўкамі або крэйдамі намалюйце любы прадмет, які вас зацікавіў, у квадраце і ў крузе.
- Чым, на ваш погляд, адрозніваецца ўспрыманне аднаго і таго ж прадмета ў квадраце і крузе? Падзяліцеся сваімі адчуваннямі з аднакласнікамі.
- Паразважайце, чаму Рафаэль змясціў у крузе менавіта вобраз маці.



**Рафаэль.**
Мадонна ў крэсле

## § 27. ТВОРЧЫ ЎРОК. ПАРТРЭТ СЯБРА

Уявіце, што вы атрымалі ад сябра (суседа, аднакласніка, сваяка) замову — стварыць партрэт. Адзіная ўмова заказчыка — партрэт павінен быць арыгінальным, не падобным на іншыя. Як перадаць аблічча сябра, раскрыць яго ўнутраны свет, характар і індывідуальныя рысы, прапанаваўшы пры гэтым нешта новае — форму, колер, кампазіцыю?..

Падказкай можа стаць творчасць італьянскага жывапісца Джузэ́пэ Арчымбольда. Майстра называюць вялікім выдумшчыкам, збіральнікам дзівацтваў, а яго жывапіс — фантасмагорыяй. Створаныя ім у XVI стагоддзі дасціпныя карціны-фантазіі, карціны-алегорыі, карціны-рэбусы захапляюць і сёння.

Галоўнае месца ў творчасці Джузэпэ Арчымбольда займаюць партрэты-нацюрморты, якія складаюцца з гародніны, садавіны, птушак, жывёл, рыб, раслін і іншых самых розных, часам нечаканых, прадметаў.

Партрэт «Вясна» сабраны з раслін — кветак, лісця, галінак, а партрэт «Бібліятэкар» складаецца з кніг і старажытных фармуляраў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Джузэпэ Арчымбольда.**
Вясна



**Джузэпэ Арчымбольда.**
Бібліятэкар

Разгледзьце ў інфармацыйных крыніцах не менш знакамітыя работы Джузэпэ Арчымбольда «Партрэт Рудольфа II у вобразе Вертумна» і «Аўтапартрэт мастака». Якія прадметы выбраў майстар у якасці «будаўнічага матэрыялу»?

Складзіце партрэт сябра з прадметаў, якія знаходзяцца побач з вамі. Раскажыце, што вы хацелі прадэманстраваць. Ці атрымалася ў вас? Ці спадабаўся партрэт-нацюрморт вашаму сябру?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 10

КАБ ЗРАЗУМЕЦЬ, ЦІ ЁСЦЬ У ЖЫВЁЛ ДУША,
ТРЭБА САМОМУ МЕЦЬ ДУШУ.

*Альбе́рт Шве́йцэр*

# ВОБРАЗ ЖЫВЁЛЫ Ў МАСТАЦТВЕ



**Ян Бра́йгель Малодшы.** Райскі сад

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 28. ЧАЛАВЕК І ЖЫВЁЛЬНЫ СВЕТ



Фрагмент роспісу пячоры Ласко (Францыя)

Тэма жывёльнага свету шырокая і шматгранная. У мастацкай культуры яна мае глыбокія карані.

У далёкія часы першабытны чалавек не аддзяляў сябе ад прыроды. Ён падоўгу назіраў за жывёламі, іх рухамі і звычкамі. Невыпадкова выявы звяроў з'явіліся раней, чым выявы людзей. Малюнкі атрымліваліся настолькі дакладнымі і выразнымі, што не перастаюць захапляць і сёння.

Вядома некалькі пячор, у якіх захаваліся малюнкі, створаныя першабытным чалавекам. Адна з іх знаходзіцца ў Францыі і называецца Ласко. Скляпенні пячоры пакрытыя выявамі розных жывёл.

На пярэднім плане мы бачым быка з перабольшана доўгімі рагамі. Мастак нібыта папярэджвае: *«Бык вельмі небяспечны, бойся яго»*. Наводдаль — група аленяў. Іх галінастыя рогі ўтвараюць мудрагелісты ўзор. Верагодна, алені і тады былі палахлівыя: у лёгкіх контурах іх фігур не змяшчаецца нічога жахлівага.

Таксама ў пячоры ёсць некалькі выяў дзікага каня. Адна з іх распавядае нам пра тое, дзе пасвіцца жывёла. Вецер прыгінае высокія





Фрагменты роспісу пячоры Ласко (Францыя)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

травы і прымушае віцца грыву. Вялікае цела працята дзідай, а магчыма, стралой.

Прайшло шмат тысяч гадоў з таго часу, калі былі выкананы гэтыя наскальныя малюнкі. Аднак, уважліва ўзіраючыся ў іх, мы нібы чуем аповед старажытнага майстра пра тое, што яго трывожыць, чаму ён радуецца і на што спадзяецца...

Паступова чалавек пачаў прывучаць некаторых дзікіх звяроў жыць побач з сабой. Займальную гісторыю пра гэта расказаў у казцы «Кошка, якая гуляла сама па сабе» англійскі пісьменнік і падарожнік Рэдзья́рд Кі́плінг.

...Дзікі сабака падышоў да ўвахода ў пячору, носам узняў сушаную конскую скуру ды ўцягнуў ноздрамі вабны пах смажанай бараніны. Жанчына, якая глядзела на лапатачную костку, пачула, што сабака нюхае, засмяялася і сказала:

— Вось першы. Дзікі звер з дзікіх лясоў, што табе трэба?

Дзікі сабака адказаў:

— Мой вораг і жонка майго ворага, што гэта так смачна пахне ў дзікім лесе?

Жанчына ўзяла падсмажаную костку барана, кінула яе дзікаму сабаку і сказала:

— Дзікі звер з дзікага лесу, пагрызі і паспрабуй.

Дзікі сабака стаў грызці костку і зразумеў, што яму яшчэ ніколі не даводзілася есці такіх прысмакаў. Пад’еўшы, сабака сказаў:

— Мой вораг і жонка майго ворага, дай мне яшчэ костку!





**Віктар Дуві́даў.**
Ілюстрацыі да казкі Р. Кіплінга «Кошка, якая гуляла сама па сабе»



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Жанчына ж адказала:

— Дзікі звер з дзікага лесу, днём дапамагай майму мужу паляваць, а ўначы ахоўвай яго пячору, тады я буду даваць табе столькі смажаных костак, колькі ты захочаш.

Дзікі сабака ўвайшоў у пячору, паклаў сваю галаву на калена жанчыны і сказаў:

— Мой сябар і жонка майго сябра, днём я буду дапамагаць чалавеку паляваць, а ўначы буду вартаваць вашу пячору.

*Рэдзьярд Кіплінг. Кошка, якая гуляла сама па сабе*

З цягам часу людзі перасталі баяцца жывёл. Жыццё звяроў і птушак стала залежаць ад чалавека і яго дзейнасці.

На карціне «Райскі сад» галандскага мастака Я́на Брэ́йгеля Малодшага ў цудоўным лесе мірна суседнічаюць розныя жывёлы: тыгры, казулі, быкі, малпы, папугаі, лебедзі... Ніхто нікога не баіцца, ніхто ні за кім не гоніцца. Такія «райскія» адносіны магчымы толькі ў ідэальных марах. Аднак фантазія, увасобленая мастаком, заключае глыбокую думку: як было б добра, калі б у свеце зніклі варожасць, злосць і страх.

Творы мастацтва дапамагаюць нам зразумець, якія адносіны склаліся ў чалавека з тымі, хто лётае, бегае, поўзае і плавае, але не ўмее размаўляць і, магчыма, мае патрэбу ў любові або дапамозе.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Разгледзьце ў электронным дадатку малюнак з пячоры Ласко. Успомніце з урокаў гісторыі, як называўся гістарычны перыяд, калі былі знойдзены першыя выявы жывёльнага свету. Апішыце малюнак па плане:

- Колькі жывёл вы бачыце? Якіх жывёл вы пазналі? Што яны робяць? Чым яны падобныя да рэальных жывёл і чым адрозніваюцца?
- Чаму ў малюнках акцэнтаваны розныя дэталі (тоўстыя або тонкія рогі, масіўнае або стройнае цела, доўгія або кароткія ногі)?
- Назавіце 2–3 прычыны, па якіх старажытны чалавек ствараў выявы дзікіх жывёл.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны «Райскі сад» Яна Брэйгеля Малодшага. Пералічыце ўсіх жывёл, якія на ёй намаляваны. Ці ёсць на карціне нерэальныя вобразы? Калі ёсць, апішыце іх падрабязна.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах незвычайны музычны твор «Калыханка кіці́хі» амерыканскага кампазітара Пола Уі́нтэра.

- Чаму твор называюць «жывой» музыкай? Якое ўражанне яна зрабіла на вас?
- З дапамогай якіх выразных сродкаў перадаецца любоў маці да малога?
- Якія немузычныя гукі вы пачулі ў кампазіцыі? Якія гукі — музычныя ці немузычныя — у гэтым творы галоўныя?
- Для стварэння якога эфекту Пол Уінтэр выкарыстаў у сваёй музыцы жывыя гукі і галасы прыроды?
- Чаму музыку Пола Уінтэра называюць «экалагічнай»?

Услухайцеся ў гукі прыроды, якія вас акружаюць. Запішыце іх з дапамогай тэлефона. Паслухайце любы музычны твор на фоне вашага запісу. Што ў вас атрымалася?

## § 29. ЯК МАСТАКІ СТВАРАЮЦЬ ВОБРАЗЫ ЖЫВЁЛ?

Многія майстры мастацтва ў сваіх творах ствараюць вобразы жывёл. Мастакоў-*анімалістаў* прываблівае ў гэтай тэме магчымасць перадаць прыгажосць рухаў, асаблівасці знешняга выгляду — мяккай шэрсці або гладкіх бліскучых пёраў, вільготнай лускі або гузаватага панцыра.



**Дыега Веласкес.**
Галава аленя

Таленавітых майстроў прыцягвае менавіта ўнутраны стан звера, а не яго знешнасць. Іспанскі мастак Дыега Веласкес любаваўся высакароднасцю аленя. Яго карціну можна назваць «партрэтам жывёлы-арыстакрата».



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Паўлюс Потэр.**
Ланцужны сабака



**Сюй Бэйхун.**
Конь, які скача



**Пётр Клот.**
Кабыла з жарабём

Галандскі жывапісец Па́ўлюс Потэр стварыў вобраз гераічнага сабакі, які пільнаваў спакой людзей. З-за вясновай лінькі добра бачныя моцныя мышцы сабакі. Дзякуючы нізкай лініі гарызонту складаецца ўражанне значнасці намаляванага: надзейны абаронца на варце.

А як ярка перадаў нястрымны нораў каня кітайскі майстар Сюй Бэйху́н! Выразныя плямы, энергічныя мазкі перадаюць скокі каня. Адчуўшы вецер свабоды, ён імчыцца наперад. Набліжэнне настолькі імклівае, што навакольныя прадметы становяцца неадметнымі.

Прыгажосць формаў цела жывёлы, натуральнасць паставаў і рухаў прыцягваюць увагу скульптараў. Рускі скульптар Пётр Клот у кампазіцыі «Кабыла з жарабём» здолеў адлюстраваць пяшчоту і мяккасць рухаў жывёл. Адчуваецца далікатнасць жарабяці, якое нядаўна з'явілася на свет.

Чалавека не могуць не захапляць спевы птушак. Птушыны гоман, ціхае буркаванне ці звонкія пошчакі чутныя і ў народных песнях, і ў творах прафесійных кампазітараў. Музычныя інструменты і галасы вакалістаў перадаюць прыгажосць спеваў птушак.

У п'есе «Сакавік. Песня жаўранка» з фартэпіяннага цыкла «Поры года» Пётр Чайкоўскі расказвае пра птушак, прадвеснікаў вясны. Першымі вяртаюцца з цёплых краін жаўранкі. Іх вясновыя пошчакі чуюцца ў мелодыі. То летуценна-сумная, то светлая


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Мельхіёр дэ Хондэкутэр.**
Куры і качкі

музыка перадае адчуванне наступлення вясны. У канцы п'есы птушыныя пошчакі сціхаюць і ледзь чутныя.

Французскі кампазітар Камі́ль Сен-Санс стварыў заалагічную фантазію «Карнавал жывёл». Гэта сюіта складаецца з 14 частак. Атрымліваючы асалоду ад гукаў музыкі, мы ўяўляем, як перад намі праходзяць велічны леў і куры з пеўнямі, якія знаходзяцца ў пошуках корму, імчацца антылопы, скачуць кенгуру, чуем шчэбет птушак, кукаванне зязюлі... Усе гэтыя і іншыя вобразы стварае незвычайны ансамбль інструментаў.

**Анімалі́ст** — мастак, які ў сваіх творах выяўляе жывёл.

Некалькі твораў прысвяціў птушкам галандскі жывапісец Мельхіёр дэ Хондэку́тэр. За дакладнасць у адлюстраванні свойскіх і дзікіх птушак разнастайных відаў сучаснікі называлі яго «птушыным Рафаэлем».

Майстры ўсіх відаў мастацтва звяртаюцца да тэмы жывёльнага свету, таму што ў ёй можна паказаць асаблівасці характару і паводзін звяроў і птушак. Дзякуючы творам мастацтва чалавек можа любавацца прыроднымі вобразамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Падбярыце некалькі слоў-эпітэтаў да малюнкаў жывёл у параграфе і электронным дадатку.

2. Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах музычныя творы «Сакавік. Песня жаўранка» Пятра Чайкоўскага, «Пераклічка птушак» Жа́на-Філі́па Рамо і «Птушнік» Каміля Сен-Санса. Чым падобныя і чым адрозніваюцца вобразы птушак? Якія гукаўтваральныя прыёмы дазволілі іх увасобіць? Які з твораў паводле характару і настрою сугучны карціне «Куры і качкі» Мельхіёра дэ Хондэкутэра?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Поўны гумару нумар «Каціны дуэт» прыдумаў італьянскі кампазітар Джаакі́на Расі́ні. Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах, як яго выконваюць Мансэра́т Кабалье́ і Конча Вела́ска. Апішыце характар гераінь гісторыі.

Падрыхтуйце ў групах тэатральную сцэнку па матывах музыкі:
- выберыце асноўных дзейных асоб;
- прадумайце пачатак гісторыі;
- вызначце месца падзей;
- пакажыце з дапамогай рухаў, пра што каты гавораць, як адзін да аднаго ставяцца; як заканчваецца ваша гісторыя?

# § 30. ТАКІЯ РОЗНЫЯ ЖЫВЁЛЫ

Успрымаючы мастацкія творы, у якіх адлюстравана тэма жывёл, мы лёгка пазнаём іх герояў. Асабліва калі майстры мастацтва надзяляюць жывёл якасцямі, уласцівымі чалавеку.

У казках, байках вобразы жывёл настолькі звыклыя, што не здзіўляюць нас. Звяры і птушкі думаюць, размаўляюць і дзейнічаюць, як людзі. Жывёлы сталі носьбітамі пэўных якасцей, якія чалавек хоча бачыць у сябе. У многіх народаў мядзведзь увасабляе сілу, леў і арол — уладу. Гэтыя і іншыя магутныя жывёлы сталі сімваламі гарадоў і дзяржаў, што знайшло адлюстраванне ў выявах гербаў.


Герб г. Гомеля



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У многіх беларускіх гарадах усталяваны помнікі жывёлам. У Баранавічах паставілі помнік вераб’ю і заснавалі свята ў гонар гэтай маленькай птушачкі. А ў Бабруйску з’явілася некалькі помнікаў бабру — жывёле, у гонар якой названы горад. У Ваўкавыску ў гонар тысячагоддзя горада ўзвялі помнік ваўку.



Герб г. Гродна

Невялікія фігуркі і схематычныя малюнкі жывёл здаўна былі часткай побыту. Традыцыйнымі для беларускага народа з’яўляюцца вырабы з саломы. З яе робяць фігуркі птушак, якія прыносяць шчасце ў дом; конікаў, з якімі ў хату ўваходзіць дастатак.

Свістулькі з гліны, якія выдаюць гукі, падобныя на птушыныя спевы, з цягам часу ператварыліся ў маленькіх птушачак. А вышытыя на ручніку птушачкі сталі традыцыйным вясельным узорам.



**Уладзімір Гаўрыле́нка.**
Помнік бабру
(г. Бабруйск, Беларусь)

Адным з сімвалаў Беларусі з’яўляюцца зубры. Белавежская пушча захавала гэтых рэдкіх жывёл ад знішчэння. Фігуры зуброў



**Станіслаў Цалю́к.**
Помнік вераб’ю
(г. Баранавічы, Беларусь)



**Уладзімір Панцяле́еў.**
Помнік ваўку
(г. Ваўкавыск, Беларусь)



Саламяны конь



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Свістулькі-птушачкі з гліны



Традыцыйная славянская вышыўка



Зубр (мастацкае шкло)

з саломы і дрэва, гліны, фарфору, шкла ўпрыгожваюць не толькі нашы дамы, але і абшары нашай Радзімы.

За шмат тысячагоддзяў чалавек пераадолеў страх перад жывёламі, навучыўся выкарыстоўваць іх карысныя якасці, бачыць іх прыгажосць. Сёння людзям трэба навучыцца жыць у згодзе з усімі насельнікамі Зямлі, а мастацтва тут — лепшы памочнік.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Успомніце 2–3 творы мастацтва (вершы, казкі, апавяданні, фільмы), у якіх галоўнымі героямі з'яўляюцца жывёлы. Патлумачце, чаму аўтары твораў выбралі менавіта гэтых жывёл.

2. У нашай краіне шэсць абласцей. Падрыхтуйце рэпартаж пра герб кожнага абласнога горада. Якія жывёлы намаляваны на гербах? Давядайцеся з інфармацыйных крыніц, што яны сімвалізуюць. Дапоўніце матэрыял навучальнага дапаможніка.

3. Прагуляйцеся па горадзе ці пасёлку, у якім жывяце. Паглядзіце навокал — на будынкі, помнікі, сімволіку... Ці сустрэліся вам вобразы жывёл? Якія?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

4. Ці ёсць у вашым доме гадаванец? Калі ёсць, раскажыце пра яго. Хто гэта? Як яго завуць? Як вы з ім гуляеце? Як вы яго даглядаеце? Пакажыце з дапамогай рухаў характар жывёлы.

Зрабіце серыю фотаздымкаў вашага гадаванца. Калі яго ў вас няма, сфатаграфуйце жывёлу, якая жыве ў вашых суседзяў, сяброў. Для здымкаў падбярыце самыя цікавыя моманты, якія адлюстроўваюць характар гадаванца.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 11

ДОМ — ГЭТА ТАМ, ДЗЕ ТВАЁ СЭРЦА...

*Плі́ній Старэйшы*

# МАСТАЦТВА Ў НАШЫМ ДОМЕ



**Васіль Су́мараў.** Мой дом

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 31. НАШ ДОМ — НАШ СВЕТ

Кожны чалавек імкнецца ўпрыгожыць сваё жыллё, зрабіць яго ўтульным і непаўторным. Праз уладкаванне жылля мы перадаём сваё ўяўленне аб прыгажосці. Наш дом — гэта наш маленькі свет. Якім мы створым яго, такой будзе і атмасфера ў ім. Дом, які напоўнены святлом, іскрыцца вясёлкавымі фарбамі, гучыць радаснай мелодыяй, дорыць яго насельнікам цяпло і ўтульнасць.

Дом як жыллё чалавека вядзе сваю гісторыю са старажытных часоў. У першабытную эпоху ім нярэдка служылі пячоры. У роспісах пячор людзі адлюстроўвалі важныя для сябе вобразы — вынікі сваіх назіранняў.

У Старажытным Егіпце ў роспісах сцен розных пабудоў выкарыстоўваўся бытавы сюжэт. У ім ёсць і прыродныя матывы — расліны, звяры, птушкі, рыбы.

У эпоху Антычнасці пачалі ўпрыгожваць не толькі сцены, але і падлогі памяшканняў. Шырока выкарыстоўвалася каменная мазаіка. Так была ўпрыгожана віла Рамáна Дэль-Казíле на востраве Сіцылія. Мастакі адлюстравалі лоўлю дзікіх звяроў у Паўночнай Афрыцы. На пясчаных берагах сярод рэдкай расліннасці намаляваны маладыя рымляне, занятыя пагрузкай здабычы на караблі для дастаўкі ў Рым. Тут можна ўбачыць насарога, страусаў, слана, тыграў, буйвала, антылоп, вярблюдаў.



Зараснікі з качкамі ў палёце. Фрагмент роспісу па тынкоўцы (Старажытны Егіпет)



Калідор Вялікага палявання на віле Рамана Дэль-Казіле (Італія)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Замак Бодыям (Англія)

Пазней пачалі ўзводзіць замкі, якія былі цэнтрам уладанняў багатых людзей. Замак служыў як жыллём для ўладальніка, так і сховішчам для жыхароў той мясцовасці ў выпадку нападзення ворагаў.

Звычайна замкі будаваліся на ўзвышшы, сярод лясных масіваў. Тэрыторыю замка, як правіла, абкружалі ровам з вадой. Гэта рабілася з абарончымі мэтамі. Прыкладам такога збудавання з'яўляецца англійскі замак Бодыям.

Адзін з найбуйнейшых замкаў Беларусі і Усходняй Еўропы пабудаваны ў гарадскім пасёлку Мір. Мірскі замак мае блізкую да квадрата форму. Яго масіўныя сцены ўмацаваны пяццю вежамі: чатыры



**Анатоль Бараноўскі.**
Спадчына. Мірскі замак



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

размяшчаліся па вуглах, а пятая — у сярэдзіне сцяны. Менавіта ў гэтай вежы знаходзілася ўязная арка. Вежы ўзвышаліся над сценамі і былі ўпрыгожаны белымі нішамі і арнаментам. Такі *дэкор* вылучаўся на фоне чырвонай цаглянай кладкі.

На змену замкам прыходзілі шыкоўныя палацы. У кожным было мноства пакояў, упрыгожаных роспісам, ляпнінай і пазалотай. Мэбля, свяцільні, вазы, люстэркі і іншыя прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адлюстроўвалі густы і жаданні людзей, якія жылі ў гэтых палацах. У вытанчаных пакоях гучала музыка прыдворных кампазітараў. Яна ўпрыгожвала і штодзённае жыццё арыстакратаў, і разнастайныя падзеі і мерапрыемствы: званыя абеды і вячэры, сямейныя і грамадскія святы, балі і маскарады.

**Дэкор —** гэта афармленне, упрыгожванне будынкаў і архітэктурных элементаў пабудовы.

Пры палацах нярэдка разбівалі парк, дзе знаходзіліся скульптуры, фантаны, вадаёмы. Урачыстасць палацам надавала багацце і харaство дэкору.

Кожны палац будаваўся на заказ высокапастаўленай асобы і таму ўнікальны. Славу Вялікаму Кацярынінскаму палацу ў Царскім Сяле (цяпер г. Пушкін) прынесла як незвычайнае афармленне *фасадаў*, так і ўбранне пакояў.



**Барталамéа Франчэ́ска Растрэ́лі.** Вялікі Кацярынінскі палац у Царскім Сяле (Расія)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Леана́рд Марконі.** Сядзіба Умястоўскіх (в. Жамыслаў, Беларусь)

На нябесна-блакітным фоне сцен, падобна пышным аблокам, вылучаюцца белыя ствалы калон. Абрамленне вокнаў у спалучэнні з пазалочанымі рэльефамі, нібы вытканымі ззяннем сонечных прамянёў, стварае святочны выгляд будынка.

Сядзібы ў параўнанні з палацамі і замкамі выглядалі значна больш сціпла. У комплекс шляхецкай сядзібы ўваходзілі палац (сядзібны дом), гаспадарчыя пабудовы, парк або сад. Звычайна сядзібны дом не меў багатага дэкору, але вылучаўся на фоне паселішча.

**Фаса́д** — вонкавы бок будынка.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Пагартайце старонкі вучэбнага дапаможніка, паглядзіце электронны дадатак. Складзіце топ-10 архітэктурных збудаванняў, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках мастацтва. Чаму вы выбралі менавіта гэтыя збудаванні? Якое з іх вам спадабалася больш? У якім вы хацелі б жыць? Чаму?

2. Як вы разумееце знакаміты выраз англійскага палітыка Э́дварда Кока: *«Мой дом — мая крэпасць»*? Растлумачце свой пункт гледжання, выкарыстоўваючы мастацкія прыклады.

3. Людзі здаўна імкнуліся ўпрыгожыць свой дом мастацкімі творамі: карцінамі, дыванамі, статуэткамі... Часам насычалі атмасферу дома прыемным музычным фонам. Так, у арыстакратычных дамах Еўропы з XVI стагоддзя сямейныя абеды суправаджала «застольная» музыка, гэта значыць музыка, якая стваралася спецыяльна для сямейных абедаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Успомніце музычныя творы, якія вам падабаюцца. Складзіце «музычнае меню» для вашай сям'і на тыдзень. Якія «музычныя стравы» вы прапануеце, напрыклад, на дэсерт?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

4. Зрабіце фотаздымак цікавага, на ваш погляд, будынка, размешчанага ў вашым горадзе (пасёлку). Чым ён вам спадабаўся? Раскажыце пра гэта аднакласнікам паводле плана:

- Дзе будынак размешчаны і як спалучаецца з навакольным асяроддзем?
- Для чаго гэты будынак прызначаны?
- З якіх матэрыялаў узведзены?
- Як аформлены (дэкор, колер фасадаў, наяўнасць калон, форма вокнаў і дзвярэй і інш.)?
- Як прызначэнне будынка звязана з яго знешнім выглядам?

## § 32. ЖЫЛЛЁ СУЧАСНАГА ЧАЛАВЕКА

Сучаснае жыллё не падобна на жыллё чалавека, які жыў у мінулых стагоддзях. З канца XIX стагоддзя заможныя гараджане сталі будаваць шыкоўныя асабнякі, якія былі больш падобныя на маленькія палацы. Прыкладам таму з'яўляецца асабняк, узведзены для Арсенія Марозава — аднаго з найбагацейшых людзей таго часу.

А. Марозаў шмат падарожнічаў і пажадаў пабудаваць дом, які нагадваў бы яму пра паездкі ў Еўропу. Разгледзьце багаты дэкор сцен,



**Віктар Мазы́рын.** Асабняк А. Марозава (Расія)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вітыя калоны, разнастайныя аконныя праёмы. Гэты асабняк уражвае раскошай і сёння.

Не менш прыгожы асабняк прафесара Эмі́ля Тасе́ля ў Бруселі. Ён нібы створаны з мудрагелістых раслінных узораў, якія прысутнічаюць у *інтэр'еры* — у абрамленні лесвіцы, у малюнку мазаічнай падлогі, у дэкоры сцен.



**Віктар Орта.**
Асабняк прафесара Эміля Таселя (Бельгія)

На пачатку XX стагоддзя людзей перастала здзіўляць раскоша. Яна саступіла месца прастаце і рацыянальнасці. З'явіліся загарадныя вілы з прасторнымі памяшканнямі, стрыманыя і элегантныя.

Французскі архітэктар Ле Карбюзьé праектаваў вілы, цалкам пазбаўленыя дэкору. Віла Савой, якая знаходзіцца ў парыжскім прадмесці, стала ўзорам прастаты і стрыманасці — ніводнай лішняй лініі, лішняга завітка або ўпрыгажэння...

**Інтэр'е́р** — унутраная прастора будынка.



**Ле Карбюзье.**
Віла Савой
(Францыя)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Фрэнк Лойд Райт.**
Дом над вадаспадам (ЗША)

Праз дом над вадаспадам — адзін з самых вядомых дамоў у свеце — амерыканскі архітэктар Фрэнк Лойд Райт паспрабаваў наблізіць чалавека да прыроды. Дом удала ўпісаны ў прыроднае асяроддзе: ён нібы з’яўляецца часткай горнага масіву.

Незвычайны дом для сваёй сям’і ў Маскве пабудаваў рускі архітэктар Канстанцін Ме́льнікаў. Своеасаблівая цыліндрычная форма будынка прынесла яму сусветную вядомасць. Дзякуючы шматлікім шасцівугольным вокнам дом атрымаў фантастычны выгляд.



**Канстанцін Мельнікаў.**
Дом архітэктара
(Расія)

Пасля Вялікай Айчыннай вайны разбураныя гарады забудоўваліся шматкватэрнымі жылымі дамамі. Былі сярод іх і вышынныя будынкі. Адзін з такіх дамоў быў пабудаваны на Кацельнічаскай набярэжнай у Маскве. Падобна непрыступнай гары, ён і дагэтуль узвышаецца над ракой, сваім грандыёзным маштабам нагадваючы цэлы горад. Будынак упрыгожваюць шматлікія вежкі, скульптуры і высокі шпіль з зоркай.

Складаную кампазіцыю мае жылы дом на скрыжаванні вуліц Мінскай і Пушкіна ў горадзе Бабруйску. Яго незвычайны выгляд нагадвае пабудову



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




**Уладзімір Галу́шчанка,**
**Канстанцін Кожыч.**
Жылы дом на скрыжаванні
вуліц Мінскай і Пушкіна
(г. Бабруйск, Беларусь)



**Дзмітрый Чачу́лін,**
**Андрэй Расткоўскі.**
Жылы дом на Кацельнічаскай набярэжнай
(Расія)

з канструктара, у якой кожны элемент, які выступае, дапаўняе іншы, ствараючы адзінае цэлае.

Сёння формы дамоў становяцца яшчэ больш разнастайнымі. Яны не толькі адлюстроўваюць усё багацце прыроднага свету, тэхнічныя навіны, але і ўвасабляюць казачна-фантастычныя задумы архітэктараў.

Так, многія сучасныя жылыя дамы, гасцініцы сваім выглядам нагадваюць звяроў, насякомых, караблі, аўтамабілі, падводныя лодкі. Напрыклад, дом «Наўты́лус» мексіканскага архітэктара Хаўе́ра Сенасія́на падобны на мудрагелістую ракавіну малюска.



**Хаўер Сенасіян.**
Дом «Наўтылус» (Мексіка)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праходзіць час, мяняюцца людзі — становіцца іншым іх жыллё. Адно застаецца нязменным: чалавеку неабыякавы дом, у якім ён жыве са сваімі роднымі і блізкімі.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якое ўражанне зрабілі на вас архітэктурныя збудаванні, змешчаныя ў параграфе і электронным дадатку? Параўнайце іх з уражаннямі ад сузірання замкаў, палацаў, сядзіб. Як і чаму мяняецца жыллё чалавека?

2. Апішыце ваш дом. Дзе ён знаходзіцца, як выглядае? Як упісваецца ў гарадское (вясковае) асяроддзе? З якіх матэрыялаў створаны?

3. У песні «Мінск — гэта я» (музыка Сяргея Кавалёва, словы Кірылы Слукі́) герой кранальна спявае пра любімы горад. Паслухайце песню ў інфармацыйных крыніцах. Выканайце яе з аднакласнікамі. Якія песні пра родны край падабаюцца вам?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

4. Сёння распаўсюджаны выраз «разумны дом». Гэта дом, максімальна зручны для жыцця дзякуючы аўтаматызаванаму кіраванню. Правядзіце ў класе дыскусію «Разумны дом: за і супраць», падзяліўшыся на дзве каманды. Якія аргументы былі больш пераканаўчымі? Чаму?

Як вы намалявалі б разумны дом? Якія «разумныя» прадметы вы ў ім умясцілі б? Стварыце эскіз любымі графічнымі сродкамі.

## § 33. ТРАДЫЦЫЙНАЕ НАРОДНАЕ ЖЫЛЛЁ

На тэрыторыі Беларусі традыцыйны жылы дом быў драўляным. Народныя ўмельцы нярэдка ўпрыгожвалі яго дэкаратыўнай разьбой. Ажурныя драўляныя разны́я ўзоры абрамлялі вокны, дзверы, ганак, карнізы і нават вуглы дамоў.

**Народнае жыллё —** комплекс жылых і гаспадарча-бытавых пабудоў пэўнага народа.

Знешні і ўнутраны выгляд *народнага жылля* (хаты) заўсёды вылучаўся сціпласцю. Залішняя раскоша была недарэчнай. Гэта асаблівасць вызначыла традыцыі ўбрання народнага жылля.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Напрыклад, падлогу замяняла ўтрамбаваная зямля ці гліна, драўляная падлога была рэдкасцю. Дах, як правіла, накрывалі саломай. Дзверы і вокны былі невялікімі, што дазваляла захоўваць у хаце цяпло. Яна абагравалася з дапамогай печы, размешчанай у куце каля ўвахода, а асвятлялася *лучнікам*.



Жылы дом
(в. Гарадзец, Беларусь)

Найбольш шанаваным месцам у хаце быў так званы чырвоны кут, які ўладкоўвалі ў далёкім куце, па дыяганалі ад печы. Тут віселі абразы, упрыгожаныя ручнікамі. У чырвоным куце стаяў стол, засланы абрусам. Хлеб, які звычайна пакідалі на стале, таксама накрывалі ручніком.

**Лучні́к** — прылада для асвятлення памяшканняў у выглядзе стойкі з заціскам для лучыны.

Ручнікі ў побыце беларусаў адыгрывалі важную ролю. Ткалі іх рознымі спосабамі. Ад абранага спосабу залежаў малюнак. Самымі распаўсюджанымі былі малюнкі з арнаментам у выглядзе квадратаў, трохвугольнікаў, зігзагаў і выяў птушак.



Беларуская хата.
Экспазіцыя Мотальскага музея
народнай творчасці
(в. Моталь, Беларусь)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Упрыгожвалі ручнікі вышыўкай. Традыцыйнай для Беларусі з'яўляецца вышыўка крыжыкам з выкарыстаннем нітак двух колераў — чырвонага і чорнага. Па баках ручнікі аздаблялі махрамі ці карункамі. Ручнікі выкарыстоўвалі ў абрадах і рытуалах. У вершы «Ручнікі» Аркадзя Нафрановіча раскрываецца іх значэнне ў беларускай культуры.

Ручнік бялюткі для дзіцяці,
Каб чалавек хутчэй акрэп.
І вытканы рукамі маці —
Накрыць гарачы з печы хлеб.
На покуці ў хаце — Бога
Ушанаваны светлы лік.
І адмысловы — у дарогу,
І для нябожчыка ручнік.

*Аркадзь Нафрановіч. Ручнікі*

У святочныя дні жыллё змяняла свой убор. На Каляды ў чырвоным куце падвешвалі саламяных павукоў. Лічылася, што саламяны павук, які качаецца з боку на бок, ахоўвае дом і прыносіць яго жыхарам шчасце.



Ручнік



Выцінанка



Саламяны павук



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Саламяныя фігуркі недаўгавечныя, таму іх абнаўлялі з кожным новым ураджаем. А саламяных павукоў спецыяльна спальвалі, каб прыбраць з хаты ўсё дрэннае. Перад Вялікаднем, Калядамі і іншымі святамі хату ўпрыгожвалі *выцінанкамі*.

Асноўным прадметам мэблі ў беларусаў доўгі час быў куфар. У ім захоўвалі вопратку, абрусы, упрыгажэнні; паклаўшы пярыну, на ім спалі. Народныя ўмельцы звычайна фарбавалі куфры ў сіні ці зялёны колер і распісвалі разнастайнымі ўзорамі ў выглядзе кветак, букетаў, птушак, зорачак, колаў і г. д.



Беларускі куфар

**Выціна́нка** — ажурныя ўзоры, выразаныя з паперы і прызначаныя для ўпрыгожвання жылля.

Народнае жыллё было разлічана на вялікую сям'ю. Жылі сціпла, але дружна. Менавіта таму традыцыйнае народнае жыллё было асабліва цёплым і ўтульным.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Назавіце ўсе новыя словы, звязаныя з народным жыллем: лучнік, ... Паглядзіце ў слоўніку значэнне гэтых слоў. Якія прадметы і словы прыйшлі ім на змену?

2. На старонках вучэбнага дапаможніка і ў электронным дадатку знайдзіце ўсе прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Падумайце, з якой мэтай людзі ўпрыгожвалі прадметы побыту.

3. Наведайце краязнаўчы музей у сваім рэгіёне. Як ён называецца? Якія экспанаты музея запомніліся? Як гэтыя экспанаты звязаны з гісторыяй вашага краю?



Пружанская кераміка



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Прыдумайце і выканайце ў групах дэкор для аднаго з прадметаў (тэхніка і матэрыял на выбар), неабходных у народным жыллі (коўш, калаўрот, куфар, кераміка і інш.). Раскажыце, з якімі народнымі традыцыямі звязаны гэты прадмет. Падбярыце адпаведнае музычнае суправаджэнне і ўзоры народнай творчасці (казкі, прыказкі, прымаўкі). Пакажыце свой праект у класе або на школьным мерапрыемстве.

## § 34. ТВОРЧЫ ПРАЕКТ



Дом-грыб (ЗША)

Дзякуючы развіццю тэхналогій чалавек можа рэалізаваць самыя неверагодныя ідэі. У тым ліку і пры стварэнні архітэктурнага збудавання, арыгінальнага па форме або канструкцыі.

У сваіх праектах архітэктары спрабуюць адлюстраваць некаторыя прадметы, цікавыя прыродныя формы, увасобіць мары і фантазіі.



Дом-аўтамабіль (Аўстрыя)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Дом у форме фартэпіяна са скрыпкай (Кітай)

Адным з самых незвычайных у свеце сучасных дамоў, вобраз якога навеяны прыродай, з'яўляецца дом-«кактус» у Нідэрландах. Жылы дом быццам бы створаны з пялёсткаў кветак ці пасынкаў кактуса. На адкрытых тэрасах пасаджаны расліны, і дзякуючы гэтаму сам дом падобны на расліну.

Як вы думаеце, хто жыве ў такіх дамах? Якія характары і інтарэсы ў жыхароў? У якім з гэтых збудаванняў хацелі б жыць вы? Чаму?



«Танцуючы» дом (Чэхія)



Дом-«кактус» (Нідэрланды)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Успомніце, якія арыгінальныя архітэктурныя збудаванні вы бачылі. Дзе яны знаходзяцца? Падумайце, навошта архітэктары ствараюць такія збудаванні. Што яны жадаюць сказаць людзям такім унікальным спосабам?

Прыдумайце і прапануйце эскіз дома ў выглядзе музычнага інструмента альбо, магчыма, у форме, якая нагадвае жывёлу ці расліну… Смела праяўляйце фантазію! Паспрабуйце адлюстраваць у эскізе фасадаў, плане інтэр'ераў, дэкоры сваё ўяўленне пра сучасны дом. Як ваш праект адлюстроўвае ваш характар, звычкі, зацікаўленні?

## § 35. ТВОРЧЫ ПРАЕКТ. КОЖНЫ ЧАЛАВЕК — МАСТАК!

Навучальны год амаль скончыўся... Вы многаму навучыліся, паспрабавалі адказаць на пытанне «Навошта ж чалавеку неабходна мастацтва?». У кожнага з вас з'явіўся свой адказ. Гэта вельмі важны вынік. Хтосьці адкажа, што з дапамогай мастацтва можна вырашыць складаныя задачы. Хтосьці скажа, што мастацтва дазваляе за кароткі тэрмін апынуцца ў розных частках свету. Для кагосьці мастацтва — гэта магчымасць адпачыць, атрымаць задавальненне. А хтосьці захоча даведацца пра мастацтва яшчэ больш.

Усе гэтыя і іншыя вашы адказы — правільныя. Вы ўсе — вялікія малайцы!

Самае галоўнае — гэта тое, што вы навучыліся здзіўляцца, па-новаму глядзець на прадметы і з'явы, якія раней здаваліся вам звыклымі.

Дзіўную гісторыю пра тое, як можна *па-рознаму* глядзець на навакольны свет, расказаў вядомы дзеяч мастацтваў Сяргей Абразцоў.

Дождж... Людзі пад парасонамі... Ну, і што тут дзіўнага? Мокра і ўсё.

А чалавек адчыніў акно насустрач дажджу і здзівіўся яму, і ўзрадаваўся. І перадаў гэту радасць нам: «Люблю грозу в начале мая, когда весенний первый гром, как бы резвяся и играя, грохочет в небе голубом». Гэта быў паэт Цютчаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

І спыніўся іншы чалавек у здзіўленні перад дажджом, і гукі дажджу зрабіліся для яго музыкай. Гэта быў кампазітар Дэбюсі.

Прайшоў дождж. Перакінуўся вясёлкавы мост. Не маглі мастакі не здзівіцца вясёлцы, таму што яна рознакаляровая. Вось яны — вясёлкі мастакоў Пусэ́на, Урубеля, Левітана.

А вучоны сказаў: здзіўляе не тое, што вясёлка рознакаляровая, дзіўна, што гэта — раскладзены ў кроплях вады сонечны прамень...

*Сяргей Абразцоў*

Цяпер успомнім, што вы зрабілі сваімі рукамі ў гэтым навучальным годзе. Магчыма, нехта стварыў мноства малюнкаў. Камусьці было зручна выконваць праект разам з аднакласнікамі. Можа, вашы вырабы спатрэбіліся родным і блізкім і сёння ўпрыгожваюць ваш дом?

Успомніце ўсе свае вялікія і маленькія праекты. Раскажыце пра іх...

Знайдзіце ў сшытку старонку, на якой у пачатку навучальнага года вы запісалі свае творчыя ідэі і планы. Якія з іх вам удалося рэалізаваць?

Вопыт творчай працы вам абавязкова спатрэбіцца. Мы не сумняваемся ў тым, што многія з вас змаглі паглядзець на сябе і сваіх таварышаў па-новаму!



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Змест

**Раздзел 1.** **УВОДЗІНЫ Ў СВЕТ МАСТАЦТВА**
§ 1. Што такое мастацтва? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6

**Раздзел 2.** **РОЛЯ ТВОРЦЫ Ў МАСТАЦТВЕ**
§ 2. Пра што расказвае Мастак? . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
§ 3. Інструменты і матэрыялы Мастака . . . . . . . . . . . 12

**Раздзел 3.** **ЦУДОЎНАЕ Ў МАСТАЦТВЕ**
§ 4. Прыгажосць у мастацтве і жыцці . . . . . . . . . . . . 18
§ 5. Пераўтваральная сіла мастацтва . . . . . . . . . . . 21

**Раздзел 4.** **ЧАЛАВЕК У МАСТАЦТВЕ**
§ 6. Пра што расказвае партрэт? . . . . . . . . . . . . . . . 26
§ 7. Чалавек на фоне гісторыі . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
§ 8. Чалавек і праца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
§ 9. Творчы ўрок. Жывыя карціны... . . . . . . . . . . . . . 36

**Раздзел 5.** **СВЕТ ПРЫРОДЫ Ў МАСТАЦТВЕ**
§ 10. Свет прыроды ў мастацтве —
глядзім і слухаем . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
§ 11. Які настрой у прыроды? . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
§ 12. Які ў прыроды характар? . . . . . . . . . . . . . . . . . 47

**Раздзел 6.** **У СВЕЦЕ КАЗАК**
§ 13. Што такое казка? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
§ 14. Казачны вобраз у мастацтве. . . . . . . . . . . . . . . 56
§ 15. Казка старая і новая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
§ 16. Творчы ўрок.
У свеце фантазіі і ўяўлення . . . . . . . . . . . . . . . 62



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Раздзел 7.** **СЯМ'Я Ў МАСТАЦТВЕ**

§ 17. Мая сям'я . . . 64

§ 18. Традыцыі і падзеі ў сям'і . . . 67

§ 19. Дарослыя і дзеці . . . 71

**Раздзел 8.** **СВЕТ ДЗЯЦІНСТВА Ў МАСТАЦТВЕ**

§ 20. Дзіўны свет дзяцінства . . . 76

§ 21. Заняткі і захапленні дзяцей . . . 79

§ 22. Дзеці і мастацтва . . . 82

§ 23. Дзеці мараць пра будучыню . . . 85

**Раздзел 9.** **ВОБРАЗ МАЦІ Ў МАСТАЦТВЕ**

§ 24. Веліч матчынага сэрца . . . 90

§ 25–26. Свяшчэнны вобраз маці . . . 93

§ 27. Творчы ўрок. Партрэт сябра . . . 97

**Раздзел 10.** **ВОБРАЗ ЖЫВЁЛЫ Ў МАСТАЦТВЕ**

§ 28. Чалавек і жывёльны свет . . . 100

§ 29. Як мастакі ствараюць вобразы жывёл? . . . 103

§ 30. Такія розныя жывёлы . . . 106

**Раздзел 11.** **МАСТАЦТВА Ў НАШЫМ ДОМЕ**

§ 31. Наш дом — наш свет . . . 110

§ 32. Жыллё сучаснага чалавека . . . 114

§ 33. Традыцыйнае народнае жыллё . . . 118

§ 34. Творчы праект . . . 122

§ 35. Творчы праект.
Кожны чалавек — Мастак . . . 124



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне


**Колбышава** Святлана Іванаўна
**Захарына** Юлія Юр'еўна
**Грачова** Вольга Алегаўна і інш.


# МАСТАЦТВА
# (айчынная і сусветная мастацкая культура)

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам)


Рэдактары *А. В. Афанасенка, А. У. Бельская*
Мастацкі рэдактар *К. У. Максімава*
Мастак вокладкі *К. У. Максімава*
Мастак *К. У. Максімава*
Камп'ютарны набор *А. В. Афанасенкі*
Камп'ютарная вёрстка *В. Ю. Лагун*
Карэктар *А. У. Бельская*

Падпісана да друку 25.04.2022. Фармат 70 × 100 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 10,4. Ул.-выд. арк. 7,0 + 4,0 эл. дад. Тыраж 13 600 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 02.08.2013.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 от 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне